Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

+TVПРАГРАМА

26 МАЯ 2023 г. ПЯТНІЦА № 99 (29979)

ГАРАДЖАНЕ Ў ВЁСЦЫ 13

ЗАМАРАЗКІ: ПАКЛАПАЦІЦЕСЯ АБ РАСЛІНАХ! 16

КАРАТКА

- Названы ўладальнікі прэміі ўрада ў галіне якасці за 2022 год.
- **Больш за 23 працэнты пакрытай лесам тэрыторыі Беларусі займаюць штучна вырашчаныя дрэвы.**
- Улетку ў Беларусі будзе працаваць 5,9 тысячы аздараўленчых лагераў.
- **Першае раённае аддзяленне Беларускай партыі «Белая Русь» створана ў Гродзенскай вобласці.**
- Балет Вялікага тэатра Беларусі адпраўляецца на гастролі па гарадах Расіі.

ЦЫТАТА ДНЯ

Таццяна ЛЕНСКАЯ, начальнік аддзела рэфармавання, прадпрымальніцтва і малых форм гаспадарання Мінсельгасхарча:

«На пачатак бягучага года ў краіне налічвалася 3802 сялянскія (фермерскія) гаспадаркі, з якіх сельскагаспадарчую дзейнасць ажыццяўляюць 3344. У землекарыстанні гаспадарак знаходзіцца больш за 300 тысяч гектараў, а сярэдні памер зямельнага ўчастка складае 92 гектары. Трэба адзначыць, што за апошнія гады колькасць фермерскіх гаспадарак няўхільна расце. Так, калі разглядаць перыяд з 2016 года да цяперашняга часу, то іх колькасць павялічылася на 24 працэнты, з іх фермерскіх, якія займаюцца сельскагаспадарчай дзейнасцю, — на 30 працэнтаў. Акрамя таго, плошчы сельскагаспадарчага прызначэння з 2016 года павялічыліся на 80 працэнтаў».

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

«ЕЎРАЗІЙСКІ ЭКАНАМІЧНЫ САЮЗ ПАВІНЕН СТАЦЬ АДНЫМ З ЦЭНТРАЎ ПРЫНЯЦЦЯ РАШЭННЯЎ У СВЕЦЕ»

Аб чым Прэзідэнт Беларусі гаварыў на пасяджэнні Вышэйшага Еўразійскага эканамічнага савета

У Маскву Аляксандр Лукашэнка прыбыў напярэдадні, дзе ўзяў удзел яшчэ ў адным важным мерапрыемстве — пленарным пасяджэнні II Еўразійскага эканамічнага форуму. Што датычыцца ВЕЭС, то цяперашняе пасяджэнне з'яўляецца юбілейным — трыццатым. Самы час разгледзець ход выканання рашэнняў па стратэгічных напрамках развіцця еўразійскай эканамічнай інтэграцыі, падвесці вынікі міжнароднай дзейнасці саюза.

Фота БелТА.

Спачатку лідары дзяржаў правялі пасяджэнне савета ў вузкім складзе, а пасля — у пашыраным, з удзелам запрошаных высокіх гасцей. Сярод іх — Прэзідэнт Азербайджана Ільхам Аліеў, які ўпершыню прысутнічаў на пасяджэнні ВЕЭС. Па відэасувязі да лідараў краін далучыліся прэзідэнты Узбекістана і Таджыкістана Шаўкат Мірзіёеў і Эмамалі Рахмон. У фармаце відэазвароту з прывітальным словам выступіў Прэзідэнт Рэспублікі Куба Мігель Дыяс-Канель Бермудэс. У пасяджэнні таксама ўдзельнічалі Генеральны сакратар СНД Сяргей Лебедзеў, Генеральны сакратар ШАС Чжан Мін, Дзяржаўны сакратар Саюзнай дзяржавы Дзмітрый Мезенцаў.

На пасяджэнні Аляксандр Лукашэнка выказаў меркаванне, што Еўразійскі эканамічны саюз павінен стаць адным з цэнтраў прыняцця рашэнняў у свеце. «Сучасны свет знаходзіцца на стадыі глабальных перамен, уступае ў эпоху маштабных пераўтварэнняў і стратэгічнага развіцця, — звярнуў увагу беларускі лідар. — Прыходзіць усведамленне неабходнасці фарміравання на змену аднапалярнай сістэме кіравання новых цэнтраў прыняцця рашэнняў, якія забяспечваюць улік інтарэсаў усіх удзельнікаў міжнародных адносін. Увага, праяўленая да мерапрыемстваў, якія праходзяць у Маскве, адназначна сведчыць аб тым, што адным з такіх цэнтраў павінен стаць Еўразійскі эканамічны саюз».

Аляксандр Лукашэнка канстатаваў, што бакі, нарэшце, рушылі наперад у пытаннях падтрымкі праектаў у галіне прамысловай кааперацыі. Падрыхтавана рашэнне аб аказанні фінансавага садзейнічання такім праектам за кошт сродкаў бюджэту ЕАЭС. «Гэта знакавы дакумент, — лічыць Прэзідэнт. — Мы чакаем ад яго сур'ёзнай практычнай аддачы».

Па словах кіраўніка дзяржавы, па шэрагу найважнейшых пытанняў унутранага парадку дня еўразійскай інтэграцыі саюз рухаецца складана і адкрыта марудна. «Перш за ўсё размова ідзе аб фарміраванні агульных рынкаў газу, нафты і нафтапрадуктаў, рэалізацыі мерапрыемстваў лічбавага парадку дня, лібералізацыі транспартнага рынку, — удакладніў ён. — А гэта ж асноўныя для нашых эканомік сферы дзейнасці, і іх актуальнасць на фоне санкцый толькі ўзрасла. Прыярытэтнай задачай для ўсіх нас застаецца стварэнне паўнавартаснага эканамічнага саюза. Усе адзначаюць наяўнасць прагрэсу ў дадзеным пытанні, але я застаюся на ранейшай пазіцыі: ні бар'еру, ні абмежаванняў быць не павінна наогул! Гэта базавы прынцып пабудовы нашага саюза, і мы павінны дасягнуць мэты ў найбліжэйшы час».

СТАР. 2

На свае вочы

Дзе ДНК-тэст можна зрабіць? Вы ж «115»! Павінны ведаць!

Карэспандэнт «Звязды» паназірала, як у Магілёўскай вобласці працуе абагульненая даведка ЖКГ — «115»

Сёння любую камунальную праблему дапамагае вырашыць хуткая камунальная дапамога «115». У Магілёве абласная служба «Кантакт-цэнтр 115» з'явілася тры гады таму (да 2020 года паслуга была даступна толькі гораду), яна працуе ў складзе Магілёўскага абласнога Цэнтра інфармацыйных сістэм. Штодзённа сюды паступае каля тысячы-паўтары заявак. Карэспандэнт «Звязды» даведалася, як гэта адбываецца і якая спажыўцам карысць ад паслугі.

Доступ непасрэдна ў Кантакт-цэнтр для насельніцтва закрыты, усе стасункі выключна па тэлефоне, але для карэспандэнта робяць выключэнне. Каля дзвярэй сустракае начальнік службы Вольга Рудкоўская. Першай справай яна знаёміць мяне з супрацоўнікамі. У штаце 27 чалавек, штодзённа на змене працуе 9. Плюс яшчэ 11 месцаў абсталявана на выпадак пазаштатных, аварыйных сітуацый.

СТАР. 4

Праблемы і рашэнні

У зоне ўвагі — дзікія жывёлы,

або Як захаваць жыццё — сваё і насельнікаў лесу

Падчас сустрэчы міністра транспарту і камунікацый Аляксея Аўраменкі з актывам галіновага прафсаюза ўдзельнікі агучылі вельмі актуальную тэму — дарожна-транспартных здарэнняў з прычыны выхаду дзікіх жывёл на праезную частку аўтамабільных дарог. Апошнім часам такія выпадкі пачасціліся. Сутыкненні транспартнага сродку з буйнымі парнакапытнымі — ласямі, высакароднымі аленямі, кабанамі, казулямі — могуць мець негатыўныя наступствы не толькі для жывёл, але і для кіроўцаў аўтамабіляў і іх пасажыраў.

Паводле інфармацыі ДАІ, часта аварыі з удзелам дзікіх капытных здараюцца на рэспубліканскіх аўтамабільных дарогах. У прыватнасці, на М6 (Е30) Мінск — Гродна — граніца Рэспублікі Польшча (Брузгі), М2 Мінск — Нацыянальны аэрапорт Мінск, М1 (Е30) Брэст (Казловічы) — Мінск — граніца Расійскай Федэрацыі, М4 Мінск — Магілёў, М5 Мінск — Гомель, М8 (Е95) граніца Расійскай Федэрацыі (Езярышча) — Віцебск — Гомель — граніца Украіны (Новая Гута).

СТАР. 4

ISSN 1990 — 763X

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

Ідзе падпіска на «Звязду» на III квартал і II паўгоддзе

Мы абяцаем нясумнае лета з любімай газетай

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

«ЕЎРАЗІЙСКІ ЭКАНАМІЧНЫ САЮЗ ПАВІНЕН СТАЦЬ АДНЫМ З ЦЭНТРАЎ ПРЫНЯЦЦЯ РАШЭННЯЎ У СВЕЦЕ»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Аляксандр Лукашэнка адзначыў вялікую праведзеную работу па фарміраванні агульнага рынку дзяржаўных і муніцыпальных закупак. «Не без праблем, але рынак дзяржзакупак функцыянуе, — заўважыў ён. — Аднак для яго далейшага паўнавартаснага развіцця неабходны падпісанне і больш хуткае ўступленне ў сілу пагаднення аб узаемным прызнанні банкаўскіх гарантый пры ажыццяўленні дзяржаўных закупак і правіл узаемнага прызнання электроннага лічбавага подпісу. Больш за тое, ёсць рэзерв для пашырэння адпаведнага сектара эканамічных адносін. Акрамя дзяржзакупак, існуе і сфера дзяржкарпарацый. Лічу, што зняцце абмежаванняў па доступе да закупак дзяржаўных карпарацый дабратворна паўплывае на эканоміку саюза».

Прэзідэнт Беларусі пераканаты: «Наш адказ на санкцыйны ціск — актывізацыя ўзаемадзеяння з ШАС, БРІКС і АСЕАН, заключэнне новых гандлёвых пагадненняў і канструктыўнае ўзаемавыгаднае супрацоўніцтва з усімі, хто гатовы з намі сябраваць і працаваць». Пры гэтым Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу, што ў выніку павінен быць забяспечаны баланс інтарэсаў усіх удзельнікаў. «Задача няпростая, але, упэўнены, Камісія мае неабходныя навыкі і кампетэнцыі», — заявіў беларускі лідар.

Адным з прыярытэтных вектараў развіцця ЕАЭС Прэзідэнт назваў удасканаленне транспартнай інфраструктуры і развіццё эфектыўнай лагістыкі. «У сувязі з разваротам нашых экспартных патокаў на паўднёвы ўсход вельмі важна сумеснымі намаганнямі «прасекчы акно» ў краіны названага рэгіёна, — удакладніў кіраўнік дзяржавы. — Гэта бяздонны рынак для айчынных тавараў. У той жа час неабходна забяспечыць роўны доступ да існуючай і ствараемай інфраструктуры, каб у далейшым не ўзнікла непрыемных сітуацый, як у выпадку з экспартам на рынкі трэціх краін лесаматэрыялаў праз тэрыторыю дзяржаў — членаў ЕАЭС. Як Казахстан гаворыць пра каменны вугаль».

Аляксандр Лукашэнка лічыць мэтазгодным вярнуцца да разгляду пытання аб лібералізацыі аўтамабільных перавозак у трэція краіны без неабходнасці атрымання спецыяльных дазволаў.

Прэзідэнт пераканаты, што досвед Саюзнай дзяржавы можа быць запатрабаваны ў развіцці ЕАЭС. «Беларусь падтрымлівае ініцыяваную ў рамках расійскага старшынства неабходнасць вызначэння падыходаў да фарміравання новай Стратэгіі развіцця еўразійскай інтэграцыі да 2030, а недзе і да 2045 года, — звярнуў увагу кіраўнік дзяржавы. — У той жа час хачу падкрэсліць, што пры падрыхтоўцы актуальных стратэгічных дакументаў нашаму саюзу можа быць цікавы вопыт рэалізацыі некаторых ініцыятыў на ўзроўні Саюзнай дзяржавы Беларусі і Расіі, аб якім так шмат гаварыў на форуме Прэзідэнт Казахстана».

У той жа час Аляксандр Лукашэнка выступіў з перасцярогай ад залішняга захаплення стратэгічным планаваннем. «Прынамсі, гэтая карысная работа не павінна адмяняць або падмяняць практычную дзейнасць па рэалізацыі мэт і задач Дагавора аб ЕАЭС, якая вядзецца дзяржавамі-членамі і Камісіяй ужо цяпер, — канкрэтызаваў ён. — Увогуле, назапасілася маса канкрэтных пытанняў, якія трэба здымаць. Яны на паверхні».

Аляксандр Лукашэнка пераканаты, што сумеснымі намаганнямі бакі змогуць у поўнай меры рэалізаваць патэнцыял Еўразійскага эканамічнага саюза як унутры аб'яднання, так і на знешнім контуры. Тым самым удасца стварыць адзін з паўнаважкіх і адказных цэнтраў новага, шматпалярнага свету.

Закрануў беларускі лідар і адносна новы, але вельмі актуальны аспект інтэграцыі — кліматычны парадак дня Саюза. Ён звярнуў увагу на тое, што ўжо на працягу шэрагу гадоў у Еўрасаюзе актыўна рыхтуюцца да гандлю ў існуючых умовах. Механізм трансгранічнага вугляроднага рэгулявання, які распрацоўваецца краінамі Еўрапейскага саюза, стане сур'ёзным інструментам уздзеяння на міжнародны гандаль. «Еўрасаюз атрымае дадатковую магчымасць для манеўру, — сцвярджае Аляксандр Лукашэнка. — Таварыры, прызнаныя «чыстымі», будуць дапускацца на рынак, а тое, што ім не трэба, будзе проста блакіравацца. Яны ўмеюць гэта рабіць».

У сувязі з гэтым кіраўнік дзяржавы бачыць неабходнасць аб'яднаць намаганні ў рамках Еўразійскага эканамічнага саюза і выпрацаваць уласныя падыходы і меры рэагавання на кліматычныя выклікі. «Трэба планамерна рухацца да структуры эканомікі, у якой пераважаюць вытворчасці і тэхналогіі з нізкім узроўнем выкідаў парніковых газаў», — акцэнтаваў увагу Прэзідэнт.

Вышэйшы савет падпісаў пратакол аб унясенні змен у Дагавор аб ЕАЭС у частцы аказання фінансавага садзейнічання пры рэалізацыі дзяржавамі ЕАЭС сумесных кааперацыйных праектаў у галінах прамысловасці, а таксама пакет папраўак у Дагавор аб ЕАЭС — так званы III Вялікі пратакол. Кіраўнікам дзяржаў прадставілі даклады аб рэалізацыі асноўных напрамкаў міжнароднай дзейнасці ЕАЭС у 2022 годзе, а таксама аб рэалізацыі стратэгіі-2025 і інфармацыю аб выніках праведзенай у 2022 годзе работы па пытаннях натуральных манаполій.

Вышэйшым саветам абмеркавана рэалізацыя падыходаў да развіцця гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва з асноўнымі партнёрамі ЕАЭС на сярэднетэрміновую перспектыву па выніках мінулага года, планаў лібералізацыі па асобных сектарах паслуг у рамках ЕАЭС, вынікі маніторынгу выканання дзяржавамі палажэнняў, прадугледжаных правіламі рэгулявання гандлю паслугамі, установы і дзейнасці. Акрамя таго, лідары краін ЕАЭС разгледзелі змены ў рэгламенце працы ЕЭК і іншыя пытанні.

Паводле прэс-службы Прэзідэнта.

Даслоўна

«Пайменна ведаем усіх»

Перад пачаткам пасяджэння ў Крамлі Аляксандр Лукашэнка пракаментаваў журналістам заявы ў Польшчы аб паўстанні, якое рыхтуецца ў Беларусі. «На жаль, яны мае заявы не чуюць, — сказаў кіраўнік дзяржавы. — А вы, напэўна, ведаеце, што я некалькі месяцаў таму казаў пра тое, што яны рыхтуюцца да паўстання, рэвалюцыі... Я не ведаю, да чаго яны ў Беларусі рыхтуюцца. А тое, што яны рыхтуюцца ў нас да нейкага, можа, мяцяжу чарговага, мы гэта ведаем даўно. Мы адсочваем гэтых хлопцаў, пра якіх гэты хворы генерал казаў, што там ствараюцца харугвы, цэлыя палкі там ці батальёны. Яны так гэта называюць. А насамрэч... Мы ведаем, дзе яны знаходзяцца. І пайменна ведаем усіх. Мы гатовыя — няхай прыходзяць».

Аляксандр Лукашэнка таксама расказаў журналістам, аб чым гаварыў напярэдадні з Прэзідэнтам Уладзімірам Пуціным на Еўразійскім эканамічным форуме ў час фразы казахстанскага лідара Касым-Жамарта Такаева аб тым, што ў Беларусі і Расіі «ядзерная зброя адна на дваіх». У гэты момант лідары Беларусі і Расіі заўсміхаліся, абмяняліся рэплікамі і паціснулі адзін аднаму рукі. Кіраўніка дзяржавы папрасілі расказаць, аб чым ішла размова. «Калі гаворка зайшла пра ядзерную зброю, шчыра кажучы, я нават з-за акустыкі гэтай не вельмі пачуў, — падзяліўся Аляксандр Лукашэнка. — А Уладзімір Уладзіміравіч мне кажа, што вось прынята рашэнне па размяшчэнні ядзернай тактычнай зброі ў Беларусі. Ён мне пра гэта сказаў. Я кажу: «Дзякуй!» Вось пра што ішла размова. Не больш».

Бяспека

Прыярытэт — змяншэнне канфліктных патэнцыялаў і ўмацаванне ўзаемнага даверу

У Мінску адбылося пасяджэнне Савета міністраў абароны АДКБ

У пасяджэнні ўзялі ўдзел кіраўнікі абаронных ведамстваў дзяржаў — членаў Арганізацыі Дагавора аб калектыўнай бяспецы, генеральны сакратар АДКБ Імангалі Тасмагамбетаў і начальнік Аб'яднанага штаба АДКБ Анатоль Сідараў. Удзельнікі абмеркавалі выклікі і пагрозы ваеннай бяспецы ў рэгіёнах калектыўнай бяспекі дзяржаў — членаў АДКБ, а таксама пытанні ўдасканалення сістэмы крызіснага рэагавання.

Дакументы, падпісаныя кіраўнікамі абаронных ведамстваў, датычацца сумеснай падрыхтоўкі органаў кіравання, фарміравання сіл і сродкаў сістэмы калектыўнай бяспекі АДКБ, ваенна-тэхнічнага супрацоўніцтва і іншых момантаў, звязаных з умацаваннем бяспекі ў рэгіёне.

У прыватнасці, разгледжаны і зацверджаны План сумеснай падрыхтоўкі органаў кіравання і фарміравання сіл і сродкаў сістэмы калектыўнай бяспекі Арганізацыі Дагавора аб калектыўнай бяспецы на 2024 год. Найбольш значнымі мерапрыемствамі стануць сумесныя камандна-штабныя і спецыяльныя вучэнні з войскамі (калектыўнымі сіламі) АДКБ. Зацверджаны Пералік мерапрыемстваў сумеснай падрыхтоўкі органаў кіравання і фарміравання сіл і сродкаў сістэмы калектыўнай бяспекі АДКБ на перыяд да 2030 года. Акрамя таго, прынята рашэнне аб унясенні некаторых змяненняў у План сумеснай падрыхтоўкі органаў кіравання і фарміравання сіл і сродкаў сістэмы калектыўнай бяспекі АДКБ на 2023 год.

Кіраўнікі абаронных ведамстваў зацвердзілі Палажэнне аб запасах матэрыяльных сродкаў для забеспячэння фарміравання войскаў (калектыўных сіл) АДКБ і метадычныя дакументы міждзяржаўнай сістэмы каталагізацыі прадметаў забеспячэння ўзброеных сіл дзяржаў — членаў Арганізацыі. Прынята рашэнне аб заснаванні медаля «Разам да міру». Ім будуць узнагароджвацца асобы, якія ўнеслі ўклад у міратворчую дзейнасць АДКБ.

Дзейсны адказ на агрэсіўную палітыку

Віктар ХРЭНІН і Сяргей ШАЙГУ падпісалі дакументы, якія вызначаюць парадак утрымання расійскай нестратэгічнай ядзернай зброі на тэрыторыі Беларусі

Двухбаковая сустрэча кіраўнікоў ваенных ведамстваў Беларусі і Расіі адбылася перад пасяджэннем Савета міністраў абароны АДКБ. Акрамя таго, міністры абароны абмеркавалі ваенна-палітычную абстаноўку і пытанні ваенна-тэхнічнага супрацоўніцтва паміж ведамствамі.

Фота БелТА

Як заўважыў міністр абароны Беларусі Віктар Хрэнін, сёння ва ўмовах агрэсіўных выпадаў, якія не спыняюцца і гучаць ад прадстаўнікоў ваенна-палітычнага блока НАТА і не толькі, сустрэча з яго расійскім калегам мае асабліва важнае значэнне і падкрэслівае глыбіню двухбаковага супрацоўніцтва ў ваеннай і ваенна-тэхнічнай галінах. «Ідзе беспрэцэдэнтны ціск з боку калектыўнага Захаду як на Рэспубліку Беларусь, так і Расійскую Федэрацыю — ва ўсіх сферах забеспячэння нацыянальнай бяспекі нашых дзяржаў, — падкрэсліў кіраўнік абароннага ведамства. — Нам спрабуюць навязаць аднапалярны свет па ўзоры, дзе ўсе краіны кіруюцца не міжнародным правам, а падпарадкоўваюцца нейкім правілам, якія забяспечваюць прасоўванне інтарэсаў некаторых дзяржаў, якія, на думку іх кіраўніцтва, валодаюць «выключнасцю». Такое бачанне светаўладкавання прывяло да пашырэння геаграфіі міжнароднага тэрарызму, неабгрунтаванага нарошчвання групоўкі войскаў каля граніц Саюзнай дзяржавы, узрастання ваеннай напружанасці ў палітычнай, эканамічнай, інфармацыйнай сферах у рэгіёне, ды і ў свеце ў цэлым».

Віктар Хрэнін адзначыў, што ў створаных умовах Рэспубліка Беларусь зацікаўленая ў далейшым развіцці стратэгічных саюзніцкіх адносін з Расійскай Федэрацыяй у ваеннай сферы. «Праз умацаванне абавязацельстваў у нашых дактрынальных дакументах і паглыбленне двухбаковага ўзаемадзеяння, а таксама стварэнне ўмоў і прыняцце мер, якія звядуць на нішто мэтазгоднасць размоў з намі з пазіцыі сілы, — удакладніў ён. — Размяшчэнне нестратэгічнай ядзернай зброі — дзейсны адказ на агрэсіўную палітыку недружалюбных нам краін».

Віктар Хрэнін нагадаў, што работа па размяшчэнні на тэрыторыі нашай краіны нестратэгічнай ядзернай зброі была арганізавана па даручэнні прэзідэнтаў Беларусі і Расіі. Гэта было абумоўлена невыкананнем гарантый бяспекі, дадзеных Рэспубліцы Беларусь у Будапешцкім мемарандуме 5 снежня 1994 года, а таксама бесперапыннай ваяўнічай рыторыкай, падмацаванай практычнымі дзеяннямі ў адносінах да Беларусі і Расіі з боку краін калектыўнага Захаду.

Акрамя таго, для забеспячэння ваеннай бяспекі, у тым ліку абароны заходніх граніц Саюзнай дзяржавы, у Рэспубліцы Беларусь пільная ўвага аддаецца пытанням гатоўнасці і здольнасці Узброеных Сіл выканаць задачы па прызначэнні. «У рамках ваеннага і ваенна-тэхнічнага супрацоўніцтва паміж нашымі краінамі прыняты меры па нарошчванні баявога патэнцыялу рэгіянальнай групоўкі войскаў, у тым ліку аснашчэнні новымі сучаснымі ўзорамі ўзбраення — такімі, як аператыўна-тактычны ракетны комплекс «Іскандэр-М», зенітнай ракетнай сістэмай С-400, — паведаміў Віктар Хрэнін. — Праведзена пераабсталяванне самалётаў Су-25 з магчымасцю прымянення авіяцыйных сродкаў паражэння ў ядзерным аснашчэнні. Ваеннаслужачыя Рэспублікі Беларусь прайшлі навучанне на палігонах Расійскай Федэрацыі і атрымалі практычныя навыкі ў іх эксплуатацыі. Рэалізаваныя і спланаваныя мерапрыемствы яшчэ раз падкрэсліваюць стратэгічны фармат існуючага ўзаемадзеяння паміж нашымі ведамствамі. Рэспубліка Беларусь і ў будучым рашуча накіравана на ўмацаванне і развіццё цеснага супрацоўніцтва ў інтарэсах забеспячэння бяспекі Саюзнай дзяржавы».

Вераніка КАНЮТА.

Актуальна

ЯК ЗАБЯСПЕЧЫЦЬ ЭЛЕКТАРАЛЬНЫ СУВЕРЭНІТЭТ

Тэорыю і практыку выбарчага працэсу разгледзелі ў Мінску

Асаблівасці выбарчага заканадаўства розных краін, новаўвядзенні ў электаральных працэсах і тэндэнцыі правядзення выбарчых кампаній з улікам сучасных умоў абмеркавалі спецыялісты на міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі «Тэорыя і практыка выбарчага працэсу», якая прайшла ў Мінску. Арганізатарамі мерапрыемства выступілі Нацыянальны сход, Цэнтральная выбарчая камісія, Акадэмія кіравання пры Прэзідэнце. Удзельнікамі канферэнцыі сталі беларускія і замежныя парламентарыі, прадстаўнікі навуковай і педагагічнай грамадскасці, выканаўчых і распарадчых органаў, аналітыкі і эксперты ў электаральнай сферы, прадстаўнікі цэнтральных выбарчых органаў дзяржаў — удзельніц СНД.

У адпаведнасці з абноўленай Канстытуцыяй, 25 лютага 2024 года ў Беларусі пройдзе адзіны дзень галасавання. Навукова-практычная канферэнцыя стала важным этапам падрыхтоўкі да гэтай важнай грамадска-палітычнай падзеі.

НЕ ДАПУСЦІЦЬ МАНІПУЛЯЦЫЙ ЗВОНКУ

«Выбарчы працэс разам з іншымі сферамі жыццядзейнасці чалавека схільны да знешніх рызык і пагроз. Мы ўсё часцей назіраем, як электаральныя кампаніі выкарыстоўваюцца для падрыву асноў стабільнасці ў дзяржаве, становяцца аб'ектам умяшання звонку, падвяргаюцца гібрыднаму ўздзеянню. Таму актуальнасць нашай канферэнцыі абумоўленая неабходнасцю далейшага ўдасканалення выбарчых сістэм, кансалідацыі грамадства, павышэння якасці і бяспекі электаральных працэсаў. Усё гэта патрабуе ад нас актуальнага развіцця прававой базы і кіраўніцкай дзейнасці, пошуку новых формаў і метадаў інфармацыйнай работы, фарміравання ўстойлівага імунітэту супраць чужых нам каштоўнасцяў, выпрацоўкі эфектыўных мер для забеспячэння электаральнага суверэнітэту», — адзначыў **Ігар КАРПЕНКА, старшыня Цэнтральнай выбарчай камісіі**. Ён падкрэсліў, што ўсе наваўвядзенні, як заканадаўчыя, так і тэхналагічныя, ва ўмовах развіцця інфармацыйнага грамадства павінны гарантаваць адсутнасць рызык, сабатажу і падрыву даверу да выбарчага працэсу, а таксама недапушчэнне маніпуляцый звонку, што патрабуе прыняцця адпаведных аператыўных рашэнняў.

«Невыпадкова ў праекце Канцэпцыі нацыянальнай бяспекі Рэспублікі Беларусь, які вынесены на грамадскае абмеркаванне, закладзена і такое паняцце, як электаральны суверэнітэт», — звярнуў увагу Ігар Карпенка. І тут, на думку ЦВК Беларусі, вымалёўваюцца асноўныя кірункі работы. Першы — стварэнне эфектыўнай прававой, інфармацыйнай, фінансавай і арганізацыйна-тэхнічнай заслоны знешняму ўмяшанню ў электаральны працэс. Другое — прыняцце неабходных мер, накіраваных на недапушчэнне выкарыстання службовых паўнамоцтваў выбарчай асобы ўразрэз з нацыянальнымі і дзяржаўнымі інтарэсамі. Трэцяе — забеспячэнне бяспекі арганізатараў і ўдзельнікаў электаральнага працэсу, папярэджанне і прафілактыка супрацьпраўных дзеянняў. Старшыня ЦВК падкрэсліў, што абноўленае заканадаўства ўжо змяшчае шэраг прававых механізмаў, накіраваных на забеспячэнне электаральнага суверэнітэту. Самы важны прыклад — наданне канстытуцыйнага статусу Усебеларускаму народнаму сходу, які будзе вызначаць стратэгічныя кірункі развіцця грамадства і дзяржавы, забяспечваць непахіснасць канстытуцыйнага ладу, пераемнасць пакаленняў і грамадзянскую згоду, а таксама гарантаваць устойлівасць дзяржавы ў выпадку змены кіруючых эліт.

«Галоўнымі навеламі выбарчага заканадаўства з'яўляюцца ўвядзенне Адзінага дня галасавання па выбарах дэпутатаў усіх узроўняў, а таксама выбары дэлегатаў Усебеларускага народнага сходу ад структур грамадзянскай супольнасці і мясцовых Саветаў дэпутатаў. Пашыраны паўнамоцтвы Цэнтральнай выбарчай камісіі. Так, ЦВК будзе прызначаць выбары дэлегатаў Усебеларускага народнага сходу, устанаўліваць іх вынікі і праводзіць першае пасяджэнне да выбрання старшыні. Замацавана ажыццяўленне інфармацыйна-асветнай дзейнасці і метадычнага кіраўніцтва навучаннем і павышэннем кваліфікацыі асоб, якія ўдзельнічаюць у арганізацыі выбараў і рэферэндумаў», — расказаў Ігар Карпенка. Па яго словах, такі вопыт будзе асабліва цікавы для замежных калег.

Ігар Карпенка падкрэсліў, што настаў час выпрацоўкі і замацавання ўніверсальных міжнародных падыходаў да назірання за выбарчым працэсам з улікам сусветнага вопыту, у тым ліку рэгіянальных стандартаў, для арганізацыі электаральнага ўзаемадзеяння паміж усімі зацікаўленымі ў тым краінамі. «Хацелася б, каб выбары ва ўсім свеце ацэньваліся зыходзячы з фактычнай адпаведнасці прынятым стандартам, без раздзялення дзяржаў на заведама дэмакратычныя і недэмакратычныя ў залежнасці ад надзённых патрэб асобных цэнтраў прыняцця рашэнняў», — адзначыў ён. У якасці прыкладу старшыня ЦВК прывёў АБСЕ, якая павінна была стаць падмуркам новай агульнаеўрапейскай сістэмы калектыўнай бяспекі, але нязменна факусіруецца выключна на постсавецкай прасторы, у той час як краіны Захаду амаль ніколі не становяцца аб'ектам увагі арганізацыі. Пры гэтым сама АБСЕ так і не змагла выпрацаваць універсальныя стандарты ацэнкі выбараў і кіруецца выключна метадычнымі рэкамендацыямі, якія ў кожнай краіне прымяняюцца па-рознаму.

ВЕДАЦЬ САПРАЎДНЫЯ МЭТЫ ТЫХ, ХТО ІДЗЕ Ў ПАЛІТЫКУ

У сваім выступленні **Старшыня Палаты прадстаўнікоў Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА** звярнуў увагу, што выбарчы працэс актыўна выкарыстоўваецца Захадам як сродак умяшання ва ўнутраныя справы дзяржаў, змены існуючых палітычных сістэм і вектараў развіцця. Па яго словах, сур'ёзны экзамен Беларусь чакае ўжо ў пачатку наступнага года — адзіны дзень галасавання па выбарах дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў і мясцовых Саветаў дэпутатаў, выбары членаў Савета Рэспублікі і дэлегатаў Усебеларускага народнага сходу. «Тыя, каму не падабаецца самастойная і моцная Беларусь, пастараюцца выкарыстоўваць любую магчымасць, каб расхістаць палітычную сітуацыю. Дапусціць такога сцэнарыя развіцця падзей мы не маем права», — адзначыў Уладзімір Андрэйчанка. Па словах спікера, для гэтага неабходна звярнуць увагу на наступныя пытанні. Першае — усебаковы аналіз вопыту электаральных кампаній замежных краін, пазітыўных і негатыўных прыкладаў. Другое — давядзенне да насельніцтва навацый Выбарчага кодэкса. Трэцяе — інфармаванасць грамадзян аб кандыдатах, іх праграмах. «Выбаршчыкі павінны рабіць усвядомлены выбар, грунтуючыся не толькі на прафесійна-дзелавых, але і маральных якасцях прэтэндэнтаў. Сумленнасць, адкрытасць, справядлівасць сёння не менш запатрабаваныя людзьмі, чым прафесійная падрыхтоўка. Веданне сапраўдных мэт асобных грамадзян і палітычных груп, якія ідуць ва ўладу, — гэта сродак не дапусціць памылкі», — растлумачыў Уладзімір Андрэйчанка. Чацвёртае — максімальнае далучэнне да электаральных працэсаў моладзі.

«ЖЫЦЦЁВА ВАЖНА ВЫПРАЦОЎВАЦЬ АГУЛЬНУЮ СТРАТЭГІЮ»

Старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА назвала паспяховыя выбары ў любой краіне інтэрнацыянальнай перамогай, укладам ва ўмацаванне адзінай, непадзельнай бяспекі, стабільнасці і ўсеагульнага міру. «Мяркую, унікальны беларускі шлях абнаўлення Асноўнага Закона і стварэння палітыка-прававых механізмаў па ўвасабленні канстытуцыйных навацый у жыццё, а таксама ў цэлым канструявання сістэмы дзяржаўнай улады і кіравання можа быць карысны і іншым дзяржавам. Не выключана, што і тым, хто яшчэ і цяпер спрабуе крытыкаваць Беларусь, давядзецца браць з нашай краіны прыклад, каб захаваць мір і спакой на сваёй зямлі», — падкрэсліла спікер.

«Сёння недастаткова проста дзяліцца досведам і ўзбагачаць нацыянальнае выбарчае заканадаўства і правапрымяняльную практыку напрацоўкамі адзін аднаго. Краінам, якія глядзяць у адзін бок — у бок міру і глабальнай бяспекі, стваральнага развіцця ў імя цяперашняга і наступных пакаленняў, жыццёва важна выпрацоўваць агульную стратэгію па недапушчэнні ўмяшання звонку ва ўнутраныя справы», — заявіла Наталля Качанава.

Першы намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Максім РЫЖАНКОЎ падкрэсліў, што выбарчыя працэсы даўно ўжо сталі інструментам палітычнага ўздзеяння на дзяржавы з самастойным курсам. «Выбарчыя тэхналогіі даўно выйшлі за рамкі ўласна тэхнікі правядзення выбарчых кампаній і выкарыстоўваюцца часта для змены непажаданых калектыўнаму Захаду палітычных рэжымаў і ўстаранення з палітыкі самастойных нацыянальна арыентаваных кіраўнікоў нават у саміх краінах Захаду. Агульнасусветныя тэндэнцыі паказваюць, што такое ўздзеянне, у тым ліку і на нас, будзе толькі ўзрастаць. І трэба быць да гэтага гатовымі», — адзначыў ён.

Валерыя СЦЯЦКО.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Эканоміка Германіі ўвайшла ў тэхнічную рэцэсію

ВУП Германіі зніжаецца другі квартал запар, што азначае сабой тэхнічную рэцэсію, паведамляе ТАСС.

Па даных Федэральнага статыстычнага ведамства ФРГ, ВУП Германіі ў першым квартале бягучага года скараціўся на 0,3 % у параўнанні з папярэднім кварталам. А ў чацвёртым квартале мінулага года ВУП скарачаўся на 0,5 працэнта. Эксперты ведамства паказваюць на зніжэнне пакупніцкай здольнасці насельніцтва ў сувязі з высокай інфляцыяй і павышэннем цэн на энергію. Так, адзначаецца, што жыхары рэспублікі сталі эканоміць на прадуктах, адзенні і абутку, прадметах інтэр'ера. У ведамстве таксама паведамілі, што інфляцыя ў Германіі паранейшаму застаецца на даволі высокім узроўні, склаўшы ў красавіку 7,2 працэнта ў гадавым выражэнні.

Раней Міжнародны валютны фонд зрабіў несуцяшальны прагноз па развіцці нямецкай эканомікі на бліжэйшыя пару гадоў. Паводле ацэнак аналітыкаў, у гэтым годзе Германію чакае стагнацыя, а ў 2024—2026 гадах рост ВУП складзе каля 1-2 %. У справаздачы Міжнароднага валютнага фонду гаварылася, што нямецкія кампаніі на дадзеным этапе сутыкаюцца з ростам цэн на энерганосьбіты, а ў будучыні на развіццё эканомікі негатыўна паўплываюць дэфіцыт высокакваліфікаваных спецыялістаў і дэмаграфічная сітуацыя.

Мінабароны Ірана прадставіла новую балістычную ракету

Міністэрства абароны Ірана прадставіла ў чацвер новую балістычную ракету «Хайбар» далёкасцю палёту дзве тысячы кіламетраў. Як паведаміла агенцтва IRNA, запуск адбыўся на цырымоніі з нагоды дня вызвалення горада Хорамшэхр, які быў захоплены падчас ірана-іракскай вайны 1980—1988 гадоў. Ракета з'яўляецца найноўшай у серыі «Хорамшэхр» і здольная несці боегалоўку вагой да 1,5 тоны. Як сцвярджаецца, сістэма навядзення ракеты адключаецца пры ўваходзе ў атмасферу, што робіць яе неўспрымальнай да работы сістэм радыёэлектроннай барацьбы. Хуткасць ракеты дасягнула 16 махаў за межамі атмасферы (каля 19 600 км/г) і васьмі махаў (каля 9800 км/г) у атмасферы.

Памерла амерыканская спявачка Ціна Цёрнер

Аб гэтым Sky News увечары серады паведаміў яе прэс-сакратар.

«Ціна Цёрнер, «каралева рок-н-рола», мірна памерла ва ўзросце 83 гадоў пасля працяглай хваробы ў сваім доме ў Кюснахце недалёка ад Цюрыха», — гаворыцца ў заяве.

Ціна Цёрнер — уладальніца васьмі прэмій «Грэмі». Часопіс Rolling Stone называў яе адной з найвялікшых спявачак сучаснасці. Сваю кар'еру яна пачала ў 1960-х і з таго часу выпусціла дзевяць альбомаў. У 2021 годзе была ўведзена ў Залу славы рок-н-рола.

У 2016 годзе ў Ціны Цёрнер быў дыягнаставаны рак, а ў 2017 годзе яна перанесла трансплантацыю ныркі.

Блізкая ўлада

ВЫКАНКАМЫ НА СУВЯЗІ

Практыка правядзення прамых ліній рэгіянальнай «вертыкаллю» працягваецца. Калі ў вас ёсць пытанні або праблемы, якія патрабуюць умяшання органаў улады, тэлефануйце.

Тэлефонныя лініі ў суботу, 27 мая, з 9.00 да 12.00 правядуць:

• намеснік старшыні Брэсцкага аблвыканкама Дзмітрый Мікалаевіч ГАРАДЗЕЦКІ. Тэл. 8 016 226 99 26;

• першы намеснік старшыні Віцебскага аблвыканкама Анатоль Канстанцінавіч ЛІНЕВІЧ. Тэл. 8 021 222 22 22;

• намеснік старшыні Гомельскага аблвыканкама Андрэй Васілевіч КАНЮШКА. Тэл. 8 023 233 12 37;

• намеснік старшыні Гродзенскага аблвыканкама Віктар Францавіч ПРАНЮК. Тэл. 8 015 273 56 44;

• першы намеснік старшыні Магілёўскага аблвыканкама Сяргей Канстанцінавіч САВІЦКІ. Тэл. 8 022 250 18 69;

• намеснік старшыні Мінскага аблвыканкама Дзяніс Мікалаевіч КУРЛЕНКА. Тэл. 8 017 500 41 60;

• намеснік старшыні Мінскага гарвыканкама Аляксандр Уладзіміравіч ЧЭРНІКАЎ. Тэл. 8 017 222 44 44.

Дзе ДНК-тэст можна зрабіць? Вы ж «115»! Павінны ведаць!

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Першае ўражанне, што я трапіла на нейкую тэлефонную станцыю. Жанчыны сядзяць перад маніторамі з тэлефоннымі трубкамі ў руках, працоўныя месцы падзелены перагародкамі, у кожнай супрацоўніцы на перагародцы свой нумар. Каб не перашкаджаць адна адной, да тэлефонаў падключаны навушнікі з мікрафонам. Тэлефоны, здаецца, звоняць без перапынку. Але затрымкі ў рабоце няма. І гэта відаць на вялікім дысплеі.

— Бачыце вунь тыя нулі, гэта значыць, што з усімі, хто патэлефанаваў, ужо вядуць бяседу, — тлумачыць суразмоўніца. — Калі ўзнікае чарга, тут жа ўключаюцца дадатковыя работнікі з ліку вядучых спецыялістаў. Час чакання для кліента складае максімум хвіліну. Болей можа быць толькі ў тым выпадку, калі ўзнікае сітуацыя, дзе ад нас нічога не залежыць. Адбыліся, напрыклад, планавыя або аварыйныя адключэнні па жылым фондзе.

Работа з кліентамі — задача адказная. Трэба добра разбірацца ў заканадаўстве, умець працаваць са спецыяльнай праграмай і ведаць структуру ЖКГ. Заяўку неабходна аператыўна камусьці пераадрасаваць, каб з ёй пачалі працаваць. Практычна ўсе супрацоўнікі службы — людзі вопытныя, маюць вышэйшую адукацыю, многія — камунальны стаж.

На змене працуюць адны жанчыны, але, як удакладняе Вольга Алегаўна, ёсць і мужчыны.

— У калектыве іх чатыры, — кажа яна. — Мужчынам з кліентамі размаўляць прасцей. Калі тыя чуюць мужчынскі голас, становяцца больш лагоднымі. Часам тэлефануюць неўраўнаважаныя, крычаць, выкарыстоўваюць нецэнзурную лаянку. Лічаць, што мы павінны да іх прыехаць.

Па выніках работы за месяц вызначаецца найлепшы работнік. Гэтым разам ім стала Алена Галанчанка. Спецыялістам па рабоце з кліентамі працуе ўжо трэці год. Хоць у сістэме ЖКГ яна не навічок, усё роўна прыйшлося вучыцца. Тут свае нюансы.

— Для мяне ўсё было новае — праграма, інфармацыя, — расказвае яна. — Званкі бываюць вельмі неспадзяваныя, часам у ступар уводзяць. Было, што пыталіся, як вылечыць грыбок на нагах, цікавіліся, чаму капуста падаражэла або дзе ў Магілёве можна зрабіць ДНК-тэст? Прыходзіцца нагадваць, што мы служба камунальная. Заказваюць таксі або білет на цягнік. Ёсць такія індывіды, якія тэлефануюць вельмі часта, іх тут нават па голасе пазнаюць.

Служба «115» працуе па праграме АС «Дыспетчарская служба». Яна вельмі зручная, дазваляе сістэматызаваць заяўкі па арганізацыях, раёнах, відах работ, нясправнасцях па дні, месяцы і часе паступлення. З яе дапамогай лёгка ў рэжыме анлайн накіраваць сігнал ад жыхара ў эксплуатацыйную арганізацыю і адсочваць пратэрмінаваныя заяўкі.

— Калі кліент тэлефануе, мы фіксуем яго імя, імя па бацьку, прозвішча, адрас, паверх і пад'езд. Усё для таго, каб было аператыўней, — расказвае Алена Галанчанка. — Калі чалавек раней звяртаўся, ён ужо будзе ў базе. Для таго каб нешта ўдакладніць, мы адкрываем яго заяўку, і там ужо поўная інфармацыя. Яна паступае ад тых, хто непасрэдна працуе над заяўкай. Пакуль яе не выканаюць, пытанне будзе знаходзіцца на кантролі. Увесь гэты час мы на сувязі з арганізацыяй, адсочваем працэс.

На разгляд заяўкі даюцца суткі, але сітуацыі бываюць розныя. Не ўсё можна зрабіць за такі тэрмін. Таму арганізацыя, якая будзе выконваць работы, павінна адразу ж удакладніць, колькі ёй спатрэбіцца часу. Гэты тэрмін і будзе на кантролі.

Умоўна звароты ад насельніцтва можна падзяліць на сезонныя. Зімой скардзяцца, што снег дрэнна прыбіраюць, летам — на перабоі з вадой, пакос травы, дрэнны стан пясочніц для дзяцей, адсутнасць рамонту дзіцячага абсталявання. Восенню наракаюць на лісце, вясной просяць краіраваць дрэвы.

Раённыя праблемы адрозніваюцца ад гарадскіх. Спецыялісты кажуць, што на перыферыі часта не задаволеныя якасцю вады і нізкай тэмпературай гарачай. Больш за ўсіх, па іх назіраннях, звоняць са Шклоўскага, Магілёўскага і Асіповіцкага раёнаў. І праблемы там больш складаныя ў вырашэнні.

Служба ўшчыльную працуе з ўсімі камунальнымі прадпрыемствамі — «Зелянбуд», Дарожна-маставое прадпрыемства, цеплаеткі, водаканал, упраўленне камунальных прадпрыемстваў, жылкамгасы. Усе яны задзейнічаны ў рабоце са зваротамі грамадзян.

— Штомесячна мы падводзім вынікі: колькі заявак паступіла, якія работы выконваліся, якія арганізацыі спрацавалі лепш, якія — горш, — кажа начальнік. — Падаецца працаваць з Дрыбінскім, Касцюковіцкім жылкамгасамі. Яны ўсё робяць хутка і якасна. Але ёсць такія, хто несур'ёзна ставіцца да заявак, нават ігнаруе іх. І мы тэлефануем, патрабуем прыняць меры. Кожны панядзелак робім справаздачу ў аблвыканкам, адзначаем, дзе разгледжаны заяўкі, дзе — не.

Асабіста ад спецыялістаў службы «115» мала што залежыць. Яны, наадварот, на баку кліента. Дапамагаюць паскорыць працэс. Калі чалавеку тэрмінова патрэбна дапамога, пытаннем ушчыльную займаецца старшы па змене. Ён можа папярэдзіць начальства, прыняць іншыя больш дзейсныя меры.

— Мы павінны браць на сябе адказнасць, калі ўзнікла пазаштатная сітуацыя, — расказвае старшая па змене Наталля Вырво. — Бывае, што чалавек знаходзіцца ў Мінску, а ў яго магілёўскай кватэры здарылася бяда. Тады заяўку з Мінска пераадрасуюць нам. І пакуль яна не вырашыцца, мы будзем трымаць сувязь з мінчанамі. Магіляўчане могуць даць заяўку на Брэст, любы іншы горад. І яна будзе выкананая. Толькі ў гэтага ланцужка крыху больш звенняў.

Бываюць дні, калі ідзе проста шквал званкоў. Але не заўсёды звоняць, каб паскардзіцца.

— На свята пра нас успамінаюць вясёлыя людзі, — усміхаецца Наталля. — Тэлефануюць, каб павіншаваць.

Дыспетчар Кацярына Прыборкіна працуе ў службе «115» таксама трэці год. У адрозненне ад іншых, яна цалкам памяняла сваю прафесію, прыйшла з гандлю.

— Складана было першы час, — прызнаецца. — Сюды звяртаюцца не тыя, у якіх усё добра. Павінна быць псіхалагічная падрыхтоўка. Часам пасля размовы разумееш, што трэба аднавіцца. У нас вунь і стэп-трэнажор ёсць, здымаем напружанне.

Дыспетчар службы «115» на працоўным месцы знаходзіцца суткі. Калі патрэбны тэхнічны перапынак або прыпінішча на абед, тэлефон становіцца на паўзу. Званок у гэтым выпадку будзе пераадрасаваны на іншага дыспетчара. Для супрацоўнікаў створаны не толькі рабочыя, але і бытавыя ўмовы. Адно з памяшканняў адведзена пад кухню, там ёсць усё неабходнае — халадзільнік, мікрахвалеўка, электрачайнік, посуд.

Асобнае памяшканне займаюць вядучыя спецыялісты. Яны таксама дапамагаюць прымаць заяўкі, але галоўная іх задача — займацца тымі зваротамі, якія доўгі час знаходзяцца на кантролі.

— Мы іх маніторым, аналізуем, пішам штотыднёвыя справаздачы ў вышэйшую арганізацыю, — удакладняе Вольга Мендзялеева. — На кантролі за тыдзень бывае да 150—200 такіх заявак. Гэта яшчэ не занадта шмат. Работа, вядома, напружаная, але такога, каб нашы супрацоўнікі пераблыталі адрас ці населены пункт, не бывае. У базе ўсё выразна прапісана — што і дзе. Хоць з некаторымі заяўнікамі працаваць няпроста. Яны даюць няправільныя тэлефонныя нумары, крыху хітруюць з абставінамі.

Для надзейнасці пасля выканання заяўкі робіцца абзвон кліентаў, каб даведацца, ці задаволены яны якасцю. Некаторыя адразу ж папярэджваюць, каб ім не тэлефанавалі. І дарма. Летась пасля 169 187 кантрольных абзвонаў больш чым 9,2 тысячы заявак было адпраўлена на дапрацоўку.

— Як наогул раней без такой службы абыходзіліся? Наколькі лепш стала? — пад канец цікаўлюся я.

— Цяпер усё празрыста, — кажа Вольга Рудкоўская. — У нашай базе прапісаны ўвесь шлях звароту. І яго бачаць нават у Міністэрстве ЖКГ, бо служба «115» адзіная. Дапамагае ўпарадкаваць і ўдасканаліць работу, запланаваць капітальны або бягучы рамонт. Па заяўках усё можна адсачыць.

Дарэчы, работнікі службы жывуць насычаным не толькі працоўным жыццём, але і грамадскім. Усе яны члены вядомай беларускай арганізацыі «Белая Русь». Калі трэба, любую добрую ініцыятыву падтрымаюць. На сцяне дыпломы, якія сведчаць пра іх дасягненні. А за перамогу ў навагоднім конкурсе на найлепшую страву — «мандарыны» з цеста — нават на календары размясцілі. І гэта таксама ганарова.

Нэлі ЗІГУЛЯ,
фота аўтара.

У зоне ўвагі — дзікія жывёлы...

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Дзікія жывёлы выходзяць на аўтадарогі з розных прычын. Часцей за ўсё — пры сезонных зменах месца пражывання, а таксама пры перамяшчэннях да месцаў кармлення. Некаторых дзікіх жывёл, як правіла, капытных, прыцягваюць раскіданыя дарожнымі арганізацыямі пясчана-салявыя сумесі. А буйныя дзікія птушкі знаходзяць на абочынах дарог дробныя каменьчыкі, якія дапамагаюць працэсу стрававання. Больш дробныя жывёлы, такія як лісы, зайцы, выходзяць на асфальт проста пагрэцца і абсохнуць ад расы, паколькі тэмпература асфальту звычайна вышэй за тэмпературу паветра. Нярэдка дзікія жывёлы выбягаюць на аўтадарогі пры пераследзе іх драпежнікамі або паляўнічымі сабакамі.

Вопытныя кіроўцы сцвярджаюць, што ў большасці выпадкаў сутыкнення з дзікім зверам можна пазбегнуць, неадкладна знізіўшы хуткасць да такога ўзроўню, калі можна імгненна спыніцца. Спецыялісты папярэджваюць, што ляснымі жыхары найбольш актыўныя ў цёмны час сутак, таму з надыходам змроку варта праяўляць павышаную пільнасць і выбіраць адпаведны хуткасны рэжым.

Калі лось, алень, заяц або іншая дзікая істота ў начны час аказваецца ў святле фар, яна аслеплена, цемра за межамі святла фар успрымаецца як сцяна, і жывёла, як правіла, пачынае кідацца. У такой сітуацыі варта спыніцца, выключыць святло фар, але пакінуць уключанымі габарытныя агні, уключыць аварыйную светлавую сігналізацыю, тым самым даючы жывёле час адаптавацца да цемры і пакінуць дарогу.

Акрамя таго, нагадаю, што, паводле заканадаўства, пры выяўленні грамадзянамі ва ўгоддзях, у тым ліку на дарогах, параненых, траўмераваных, хворых або загінулых дзікіх жывёл, забараняецца самавольна іх забіраць або перамяшчаць іх тушы. Аб фактах гібелі або ранення дзікай жывёлы неабходна паведаміць па тэлефоне 102.

У Беларусі, каб звярнуць увагу кіроўцаў на небяспечныя месцы міграцыі лясных жыхароў, на трасах устанаўліваюць папераджальныя знакі «Дзікія жывёлы». На дарогах таксама па магчымасці ўладкоўваюць сеткавыя агароджы. Але яны часта пашкоджваюцца чалавекам. Напрыклад, ягаднікі, грыбнікі, каб аблегчыць сабе шлях, робяць дзіркі ў агароджы. У выніку жывёлы праз такія адтуліны аказваюцца на трасе, а назад у лес трапіць не могуць.

Найлепшы выхад з сітуацыі — абсталяванне дарог адмысловымі і камбінаванымі праходамі або маставымі канструкцыямі для розных відаў жывёл. Суцэльныя агароджы ўздоўж дарогі вядуць да спынення натуральнай міграцыі, да перасялення жывёл у нязручныя для існавання месцы і змяншэння папуляцый. Напрыклад, буйныя парнакапытныя штодзень ад месцаў адпасу ідуць да вадапою. Часам пераадольваюць шматкіламетровыя адлегласці. У сакавіку 2018 года быў прыняты Указ № 108 Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «Аб экалагічнай сетцы», які таксама прадугледжвае мерапрыемствы па прадухіленні гібелі як земнаводных, так і капытных, што мігрыруюць праз ахоўныя прыродныя тэрыторыі.

Як адзін з варыянтаў вырашэння праблемы — будаўніцтва грунтоўнага пераходу над дарогай, або, як яго яшчэ называюць, экадука. Але гэта дарагое задавальненне, якое можа абысціся ў не адзін мільён рублёў. Ды і перш чым яго пабудаваць, неабходна навукова абгрунтаваць месца размяшчэння такога аб'екта з улікам рэльефу мясцовасці і шляхоў міграцыі дзікіх жывёл. Акрамя таго, няма гарантыі, што звер адразу пойдзе туды. Для некаторых відаў жывёл для гэтага спатрэбіцца некалькі гадоў.

Дадам, што экадукі — мерапрыемства для павышэння бяспекі дарожнага руху і захавання цэласнасці жывёльнага свету, паколькі экадук — паўнацэнная эстакада над аўтамабільнай дарогай або тунэль/труба, якія праходзяць пад дарогай, прызначаныя для жывёл. Існуе тры тыпы экадукаў: маставы, тунэльны і трубны.

Упершыню экадукі былі пабудаваны і ўведзены ў эксплуатацыю ў Францыі ў 50-х гадах XX стагоддзя. У Нідэрландах, напрыклад, уведзена больш за шэсцьсот экадукаў розных тыпаў. У Польшчы ў свой час было пабудавана 12 экадукаў рознай шырыні, ад 10 да 50 метраў у залежнасці ад рэльефу мясцовасці. Эфектыўнасць іх меншая за 10 %. Прычым добра працуюць толькі два. На астатніх адзначаны разавыя перасячэнні іх жывёламі.

Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.

На адной хвалі

ЗА КРОК ДА ПЕРАМОГІ

Фіналісты радыёконкурсу «Маладыя таленты Беларусі» працягваюць змагацца за перамогу. Цяпер ідзе заключны трэці тур творчага спаборніцтва, якое сёлета праходзіць пад знакам Года міру і стваральнай працы. Жывыя праслухоўванні ў Вялікай студыі Дома радыё пройдуць да 29 мая ўключна.

Па выніках другога тура ў фінале конкурсу ў вочных намінацыях засталіся 170 удзельнікаў. Фіналісты, улічыўшы парады прафесійнага журы, правялі работу над памылкамі і цяпер працягваюць барацьбу за званне пераможцы «Маладых талентаў Беларусі», у якога будзе магчымасць пачуць сябе на хвалях галоўнага радыёканала краіны.

Удзельнікі старэйшых узроставых катэгорый да падрыхтоўкі да заключнага тура радыёконкурсу падышлі вельмі адказна, паколькі на гэты раз ім належыць выступаць перад журы ў суправаджэнні музыкантаў сімфанічнага аркестра Белтэлерадыёкампаніі.

Нагадаем, што праект «Маладыя таленты Беларусі» ладзіцца з 2009 года і за гэты час даў магчымасць заявіць пра сябе больш чым тром тысячам выканаўцаў і калектываў. А з 2013 года прызёры конкурсу рэгулярна становяцца стыпендыятамі Спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы таленавітай моладзі. За мінулыя гады прэміі былі ўдастоены больш за 200 лаўрэатаў. І ўжо ў канцы мая стануць вядомыя вынікі жывых праслухоўванняў і будуць аб'яўлены імёны пераможцаў 12 сезона творчага спаборніцтва. А значыць творчых людзей, якія зрабілі крок да самарэалізацыі і атрымалі ў гэтым падтрымку, стане яшчэ больш.

Алена ДРАПКО.

ШАШКІ («Звязда»)

Выпуск № 192

Першыя дзве кампазіцыі склаў Валерый Свізінскі (Мінск).

№ 77



№ 77
Белыя простыя: f4, h4, g7 (3)
Чорныя простыя: c3, c5, b6, e7, b8 (5)
№ 78
Белыя простыя: a1, f2, b4, a5, g5 (5)
Чорныя простыя: c3, d4, e5, d6, a7 (5)
№ 79 Варушыла В.
Белыя простыя: f2, h2, c3, e3, b4, d4 (6)
Чорныя простыя: f4, h4, a5, g5, b6, d6, e7, g7 (8)

Латвійскага майстра шашачнай кампазіцыі Генадзя Андрэева зацікавілі бразільскія кампазіцыі аўтара рубрыкі з мінулых выпускаў. І як ён піша ў сваім лісце, пад уражаннем ад іх склаў наступныя варыяцыі.

№ 80
Белыя простыя: c1, f2, h2, b4, d4, f4, c5, e5 (8)
Чорныя простыя: a5, f6, a7, c7, e7, g7 (6)
№ 81
Белыя простыя: a1, d2, f2, h2, c3, e3, a5 (7)
Чорныя простыя: b2, f4, e5, g5, c7, e7, g7 (7)
№ 82
Белыя простыя: e1, d2, h2, b4, e5 (5)
Чорныя простыя: c3, d4, a5, g5, g7 (5)
№ 83
Белыя простыя: e1, b4, d4, e5, d6 (5)
Чорныя простыя: g3, a5, g5, g7, f8 (5)

Анонс: 27—28 мая 2023 года ў сталічнай СДЮШАР па шахматах і шашках (вул. Ракаўская, 24) пройдзе 14-ы рэспубліканскі турнір па шашках-64 памяці М. С. Гелера. Рэгістрацыя 27.05.2023, 13.00 — 13.45.

17.05 Беларуская часінка.
18.30, 19.20 Меладрама «Вялікія надзеі» (16+).
21.00 Панарама.
21.45 Эканамічнае асяроддзе (12+).
0.35 Сфера інтарэсаў.
1.10 Дзень спорту.

Беларусь 2

6.00 «Уключайся!» (12+)
10.00, 16.55 Тэлебарометр.
10.05, 18.25 «Сляпая». Дак. драма (16+).
10.35, 18.55 «Знакі лёсу». Дак. драма (16+).
11.05, 17.00 Серыял «Моцныя арэшкі» (16+).
12.30, 20.45, 21.15 Серыял «Практыка» (12+).
14.20, 19.25 Серыял «ІП Пірагова» (16+).
15.35 Мультсерыял «Прастаквашына» (6+).
15.55 Нічога сабе ньюз (12+).
16.00 «ПІН_КОД» (12+).
21.10 Спартлато 5 з 36, КЕНА.
22.50 «Зразумець. Дараваць». Дак. драма (16+).
23.50 «На тыдзень» (16+).

Беларусь 3

7.00 «Дабраранак».
7.35, 12.30 «Беларуская кухня».
8.05, 13.00, 16.45, 20.30, 0.10 «Навіны культуры».
8.15, 18.40 «Зорге». Маст. фільм (16+) [СЦ].
10.00, 21.05 «Вялікая вайна». Дак. драма (12+).
10.55, 17.25 «Амністыя». Маст. фільм (12+) [СЦ].
12.15 «Архітэктура Беларусі» [СЦ].
13.10, 22.00 «Бітва за Маскву». Фільм першы (12+) [СЦ].
14.40 «Кадры жыцця».
15.35 «Будзе свята».
16.55 «Новыя людзі».
20.40 «Калыханка» (0+).
23.30 «Працоўны фронт». Фільм дзясяты.
23.55 «Гісторыя. Факты».

Беларусь 5

7.00 Футбол. Чэмпіянат Расіі.
8.55 Футбол. Чэмпіянат Расіі. Агляд.
9.50 Хакей. Кубак Будучыні. Беларусь (U-21) — Беларусь (U-20).
11.45 Спорт-кадр.
12.20 Хакей. Кубак Будучыні. Расія-1 (U-20) — Расія-2 (U-20).
14.15, 21.00 Танцавальны спорт. Чэмпіянат Беларусі.
16.20 Футбол. Чэмпіянат Іспаніі.
18.20 Слэм-данк.
18.50 Гандбол. Чэмпіянат Беларусі. Мужчыны. «Мяшкоў Брэст» — СКА-Мінск. У перапынку — «Спорт-цэнтр».
20.30 Спорт-цэнтр.
20.40 Між іншым.

АНТ

6.00, 7.10, 8.10, 9.10 «Наша раніца».
7.00, 8.00, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30 Нашы навіны.
10.00 «Жыць здорава!» (16+)
11.15, 13.15 Фільм «Вярні маё каханне» (16+).
13.45, 22.40 Фільм «Асінае гняздо» (12+).
16.20 «Мужчынскае/Жаночае» (16+).
17.20, 18.20 Інфармацыйны канал (16+).
19.00 «Аб'ектыўНа» (16+).
20.00, 0.50 Час.
21.15 «Усё зразумела» з Марынай Караман» (16+).
21.25 «Трэйдар». Фільм (16+).

СТБ

6.00, 6.40, 7.45, 8.40 «Раніца СТБ».
6.30, 7.30, 8.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30 Навіны «24 гадзіны».
9.00 Дак. праект. Без падману (16+).
10.40 «Карпаў». Серыял (16+).
11.30 Дак. праект. Знак якасці (16+).
13.15 «Сімвалы Беларусі».
13.55 «Вонкавае назіранне». Серыял (16+).
16.50 «САХР». Серыял (16+).
20.15, 23.05 «СТБ-спорт».
20.20 «Сталічныя падрабязнасці».
20.30 «Міншчына».
20.50 «Вышук-3». Серыял (16+).
23.10 Дак. праект. Дзевяностыя (16+).
0.30 «Кіно»: «Экіпаж» (12+).

МІР

5.00, 10.10 Серыял «Сын бацькі народаў» [СЦ] (12+).
10.00, 13.00, 16.00, 18.30, 1.30 Навіны (бягучы радок).
13.15 «Справы судовыя. Грошы вярніце!» (16+)
14.10, 16.15, 0.30 «Справы судовыя. Бітва за будучыню» (16+).
15.05, 1.00 «Справы судовыя. Новыя гісторыі» (16+).
16.35 «Міравое пагадненне» (16+).
18.50 «Гульня ў кіно» (12+).
22.10 Серыял «Мар'ін гай-2» [СЦ] (12+).
0.05, 2.00 «Наша кіно. Гісторыя вялікай любові» (12+).
1.45 [Не]Фантастыка (12+).
3.40 Серыял «Школа выжывання ад адзінокай жанчыны з трыма дзецьмі ва ўмовах крызісу» [СЦ] (12+).

РТР—Беларусь

6.00 «Новая раніца».
10.00, 11.30, 14.30, 17.30, 21.00, 23.00 Беларусь. Навіны.
10.05 Серыял «Сямейны дэтэктыў» (16+).
11.00, 14.00, 17.00, 20.00 Весткі.
11.40 «Пра самае галоўнае» (12+).
12.50 «Кропкі над і» (16+).
14.40 «60 хвілін».
17.40 Серыял «Маскоўская барзая» (16+).
19.05 «Малахаў» (16+).
20.20 «Так! Але...»
21.30, 23.15 Серыял «Паромшчыца. Даліна мары» (12+).
23.40 «Вечар з Уладзімірам Салаўёвым» (12+).

НТБ—Беларусь

5.55 «Астрапрагноз».
6.00, 7.15, 8.20, 13.25, 16.45, 19.55, 22.25, 23.30 Сёння. Галоўнае.
6.10 «Здорава здаровым быць!» (6+)
6.55 Сфера інтарэсаў.
7.30 Гісторыі выратавання (12+).
8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00 Сёння.
8.35, 21.10 «НЗ.by».
8.55, 10.35 Серыял «Мядзведжы кут» (0+).
11.15 Серыял «Зверабой» (16+).
13.30 Надзвычайнае здарэнне.
14.00 Серыял «Гульня» (16+).
16.50 «За гранню» (16+).
18.00 «ДНК» (16+).
20.10, 21.30 Серыял «Ваенная паліцыя» (16+).
22.30, 23.45 Серыял «Рэалізацыя» (16+).

8 канал

7.00, 16.20, 17.30, 21.15, 0.40 «Надвор'е» + «Эрана».
7.05 Мультпарад.
7.30 «Прыколы 13-й школы» (6+).
7.35 Камедыя «Хадсан і Рэкс».
8.20 «Вакол свету»
9.00 Драма «Чужое жыццё» (16+).
10.30 Драма «Апошні артыкул» (16+).
12.10 Серыял «Яна напісала забойства» (12+).
13.00 «Любімае кіно» (12+).
14.35 «Рэтраспектыва» «Пакарыцелі хваляў» (16+).
16.10 Фантастыка «Сакалінае вока».
17.35 Меладрама «Спадчына» (16+).
19.00 Драма «Фаўда» (16+).
20.50 «Вечарніца».
21.00 «Фэшн is my прафэшн» (12+).
21.10 «Урокі Лазуркіна».
21.20 Драма «Клас» (16+).
22.50 «Як вырасціць чэмпіёна»
23.15 Фантастыка «Міратворац».
0.45 Драма «Джокер» (18+).

Культура

6.30, 7.00, 7.30, 10.00, 12.30, 17.00, 19.30 Навіны культуры.
6.35 «Пешшу...»
7.05 Легенды сусветнага кіно.
7.35 Прыступкі цывілізацыі [СЦ].
8.30 «Жыццё і лёс» [СЦ].
8.50 «Прыгоды Электроніка». Маст. фільм.
10.15 XX стагоддзе.
12.10 «Забытае рамяство».
12.45 Больш, чым каханне.
13.30, 21.10 «Супрацьстаянне». Маст. фільм [СЦ].
15.45 «Энігма. Глеб Фільшціньскі».
16.30, 23.25 «Усевалад Шылоўскі. Успамінаючы стары МХАТ...» [СЦ].
17.15, 1.40 Д. Шастаковіч. Сімфонія № 8.
18.20 Пісьмы з правінцыі [СЦ].
18.45 «Барыс Рыбакоў. Зіма патрыярха». Дак. фільм.
19.45 «Смеханастальгія».
20.15 Лінія жыцця [СЦ].
23.50 «Давай патанцуем». Маст. фільм.
2.40 Мультфільмы для дарослых.

Настальгія

6.00 «Спяем, сябры!» (12+)
6.55 Маст. фільм «Страх сцэны» (16+).
8.45, 9.40, 11.30, 12.55, 14.35, 15.40, 17.30, 18.40, 20.35, 21.40, 23.25, 3.40, 5.30 Музычная настальгія (12+).
9.00, 15.00, 21.00, 3.00 «Мінулы час» (12+).
10.00, 16.00, 22.00, 4.00 «Народжаныя ў СССР» (12+).
11.00, 17.00, 23.00, 5.00 «Блеф-клуб» (16+).
12.00 «Яловая субмарына» (18+).
13.10 Маст. фільм «Ніягара» (16+).
18.00 «Да і пасля...» (16+)
19.00 Маст. фільм «Жоўтае неба» (16+).
0.00 «Быў час» (16+).
1.05 Маст. фільм «Амерыканец у Парыжы» (16+).

EuroSport 1

4.00 Усе віды спорту (6+).
4.30 Скалалажанне. Кубак свету, Джакарта. Мужчыны і жанчыны (0+).
5.30, 9.30, 10.30, 11.30, 13.00, 15.00, 17.00, 20.00, 21.00 Тэніс (6+).
7.30 Скалалажанне. Кубак свету, Джакарта. Мужчыны і жанчыны (0+).
8.30, 2.00 Скалалажанне (0+).
9.00, 1.45 Усе віды спорту (6+).
20.55, 0.45 Аўтагонкі на выносівасць (6+).
0.50 Веласпорт. «Джыра д'Італія». Мужчыны (16+).
2.30 Тэніс. Турнір Вялікага шлема «Ралан Гарос» (6+).

Кінакамедыя

1.05 «Нянька па выкліку» (16+).
2.50 «Паліцэйскі з Рублёўкі. Навагоднее бязмежжа» (16+).
4.20 «Паліцэйскі з Рублёўкі. Навагоднее бязмежжа-2» (16+).
5.55 «Канваіры» (16+).
7.45 «Джуманджы» (6+).
9.40 «Ашуканцы» (16+).
11.30 «Ну, добры дзень, Аксана Сакалова!» (16+)
13.25 «Сіньёр Рабінзон» (16+).
15.30 «Цыпачка» (16+).
17.25 «Ілюзія падману» (16+).
19.30 «Ілюзія падману-2» (12+).
21.45 «Пуленепрабівальны» (12+).
23.40 «Коп на драйве» (12+).

ТБ3

6.00 Калекцыя «Беларусьфільма» (12+).
9.05 «Рыжык у Залюстроўі» (6+).
11.05, 1.15 «Паглядзім» (12+).
11.35, 1.40 «Містычныя гісторыі» (16+).
13.15, 18.40, 2.25 «Сляпая» (16+).
14.40, 19.35, 3.10 «Варажбітка» (16+).
16.05 «Анатомія забойства» (16+).
17.45 «Знакі лёсу» (16+).
20.30 «Вяселле лепшага сябра» (16+).
22.20 «Гадзіла» (16+).
0.35 «Развітанне» (16+).
4.30 «Суд ідзе». Дак. серыял (16+).

ТВ1000

5.35 Як выйсці замуж за 3 дні (16+).
7.15 Лісты да Джульеты (12+).
9.10 Спяшайся любіць (12+).
11.00 Адзін дзень (16+).
12.55, 1.25 Грошы на дваіх (16+).
15.05, 3.20 Гонка (16+).
17.10 Лемоні Снікет: 33 няшчасці (12+).

19.00 Захавальнік часу (12+).
21.10 Мільянер з трушчоб (16+).
23.25 Леў (16+).

ТБ1000 Рускае кіно

5.30 Смяшарыкі (6+).
6.10 Чуч-Мявуч (6+).
6.45 Бода Барода. Сезон 1 (6+).
7.00 Артэк: вялікае падарожжа (6+).
8.40 Прыватнае піянерскае (6+).
10.30 Прыватнае піянерскае-2 (6+).
12.20 Прыватнае піянерскае-3: прывітанне, дарослае жыццё! (12+)
14.05 Стаўка на каханне (12+).
15.45 Каханне без памеру (16+).
17.20 Грэцкі арэшак (16+).

19.00 Канікулы прэзідэнта (16+).
20.50 Пра што гавораць мужчыны. Працяг (16+).
22.30 Пра што маўчаць дзяўчаты (12+).
0.00 Любоў-маркоў (12+).
1.50 Любоў-маркоў-2 (12+).
3.40 Любоў-маркоў-3 (12+).

National Geographic

6.00, 4.50 Навуковыя глупствы (16+).
6.20, 7.05, 22.25 Надзвычайны доктар Пол (16+).
7.45, 17.05 Інжынерныя ідэі (16+).
8.35, 17.50 Сапраўдны суперкар (16+).
9.20, 10.00, 14.15, 14.55, 18.35, 5.15 Дзікі тунец (16+).
10.40, 11.25, 15.35, 16.20, 19.15, 0.30, 2.40, 3.25 Расследаванні авіякатастроф (16+).
12.10, 21.40, 4.10 Непакорны востраў (16+).
12.50, 1.15 Ліхтугі за мяжой (16+).
13.35 НЛА: Даследаванне невядомага (16+).
20.20, 23.05 Аляска (16+).
21.00, 23.50, 2.00 Карэнныя жыхары Аляскі (16+).

ЯСНАе

4.35 Серыял «Ялта 45» (12+).
6.15 Серыял «Дзяржаўная граніца» (12+).
8.00 «Ясна аб міні-футболе».
8.30 Маст. фільм «Пацучыны кут» (16+).
10.00 Серыял «Смяротная сутычка» (16+).
11.35 Серыял «Па законах ваеннага часу» (12+).
13.25 Маст. фільм «Праект «Альфа» (16+).
14.55 Серыял «Лёс дыверсанта» (12+).
16.40 Серыял «Аперацыя «Гаргона» (16+).
18.20 Футбол. Беларусбанк — чэмпіянат Беларусі. «Славія-Мазыр» — «Нафтан» (Наваполацк).
20.20 Дак. фільм «90-я. Звар'яцелы бізнес» (16+).
21.00 «Час высокіх тэхналогій».
21.25 Маст. фільм «Чорныя берэты» (16+).
22.40 Маст. фільм «13-ы раён» (16+).

0.05 Маст. фільм «Алігарх» (18+).
2.10 Маст. фільм «Краіна цудаў Вілі» (18+).
3.40 Маст. фільм «Выратавала. Нулявыя» (18+).

У праграме магчымыя змяненні. Перадрукоўка праграмы забароненая. [СЦ] – фільм транслюецца са скрытымі субцітрамі.

Беларусь 1

6.00, 7.30, 8.30 Добрай раніцы, Беларусь!
7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 13.00, 15.00, 17.00, 19.00 Навіны.
7.20, 8.20 Навіны эканомікі.
7.25, 8.25, 18.15 Зона Х (16+).
9.10 «Здорава здаровым быць!» (6+)
9.55, 11.50, 12.15, 13.05 Меладрама «Знайдзі нас, мама!» (12+)
10.55, 1.15 «Скажынемаўчы».
15.10, 18.00 Навіны рэгіёна.
15.25, 23.10 Серыял «След» (16+).
17.05 Сэнс жыцця (12+).
17.30 Дача (12+).
18.40, 19.20 Меладрама «Вялікія надзеі» (16+).
21.00 Панарама.
21.45 Клуб рэдактараў (16+).
0.55 Дзень спорту.

Беларусь 2

6.00 «Уключайся!» (12+)
10.00, 17.00 Тэлебарометр.
10.05 «Сляпая». Дак. драма (16+).
10.35 «Знакі лёсу». Дак. драма (16+).
11.05 Дэтэктыў «Моцныя арэшкі» (16+).
12.30 Серыял «Практыка» (12+).
14.20, 20.10, 21.15 Серыял «ІП Пірагова» (16+).
15.35 Мультсерыял «Прастаквашына» (6+).
15.55 Нічога сабе ньюз (12+).
16.00 «ПІН_КОД» (12+).
17.05 «Сям'я. Перазагрузка». Дак. драма (16+).
17.40 «Дарагая, я «забіў» (16+).
19.00 «Бітва сватоў».
21.10 Спартлато 5 з 36, КЕНА.
21.45 Меладрама «Джудзі» (16+).
23.40 Трылер «Пад замком» (16+).

Беларусь 3

7.00 «Дабраранак».
7.35, 12.35 «Беларуская кухня».
8.05, 13.00, 16.30, 20.30, 0.05 «Навіны культуры».
8.15, 18.40 «Зорге». Маст. фільм (16+) [СЦ].
10.05, 21.05 «Вялікая вайна». Дак. драма (12+).
10.55, 17.10 «Дарослы сын». Маст. фільм (12+) [СЦ].
12.20 «Архітэктура Беларусі» [СЦ].
13.15, 21.50 «Бітва за Маскву». Фільм другі (12+) [СЦ].
14.50 «Кадры жыцця».
15.40 «Я хачу гэта ўбачыць!» (6+)
16.05 «Сіла веры».
16.45 «Новыя людзі».
20.40 «Калыханка» (0+).
23.25 «Працоўны фронт». Фільм дванаццаты, заключны.
23.50 «Гісторыя. Факты».

Беларусь 5

7.00 Настольны тэніс. Камандны чэмпіянат Беларусі.
9.35 Міні-футбол. Чэмпіянат Беларусі.
11.30 Змешаныя адзінаборствы. UFC.
14.10 Піт-стоп.
14.30 Футбол. Чэмпіянат Расіі.
16.30 Футбол. Чэмпіянат Расіі. Агляд.
17.30 Фактар сілы.
18.00 Планета спорту.
18.20 Міні-футбол. Чэмпіянат Беларусі. У перапынку — «Спорт-цэнтр».
20.20 Футбол. Чэмпіянат Беларусі. «Дынама» (Брэст) — ФК «Мінск». У перапынку — «Спорт-цэнтр».
22.20 Змешаныя адзінаборствы.

АНТ

6.00, 7.10, 8.10, 9.10 «Наша раніца».
7.00, 8.00, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30 Нашы навіны.
10.00 «Жыць здорава!» (16+)
11.15, 13.15 Фільм «Вярні маё каханне» (16+).
13.45, 22.45 Фільм «Асінае гняздо» (12+).
16.20 «Мужчынскае/Жаночае» (16+).
17.30 «Трывожная кнопка» (16+).
18.20 «Народны ДАСТ» (12+).
19.00 «Поле цудаў» (16+).
20.10 Вячэрнія навіны.
21.15 «Лаўроў. За гранню» (16+).
21.20 «Што? Дзе? Калі? у Беларусі» (16+).
0.55 Час.

СТБ

6.00, 6.40, 7.45, 8.40 «Раніца СТБ».
6.30, 7.30, 8.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30 Навіны «24 гадзіны».
9.00 Дак. праект. Без падману (16+).
10.40 Дак. праект. Знак якасці (16+).
13.45 Дак. праект. Закулісныя войны (16+).
16.50 «Рашэнне ёсць!»
17.20 Дак. праект (16+).
18.45 «У пошуках ісціны. Нашэсце машын».
20.10, 23.05 «СТБ-спорт».
20.15 «Сталічныя падрабязнасці».
20.25 «Міншчына».
20.40 «Народны кантроль».
20.55 «Вышук-3». Серыял (16+).
23.10 Дак. праект. Дзевяностыя (16+).
0.30 Кіно: «Богі Егіпта» (16+).

МІР

5.00 Тэлесерыял «Школа выжывання ад адзінокай жанчыны з трыма дзецьмі ва ўмовах крызісу» [СЦ] (12+).
6.30, 10.10 Серыял «Мар'ін гай-2» [СЦ] (12+).
10.00, 13.00, 16.00, 18.30 Навіны (бягучы радок).
13.15 «Справы судовыя. Грошы вярніце!» (16+)
14.10, 16.15 «Справы судовыя. Бітва за будучыню» (16+).
15.05 «Справы судовыя. Новыя гісторыі» (16+).
16.35 «Міравое пагадненне» (16+).
18.50 Маст. фільм «Вакзал для дваіх» [СЦ] (12+).
21.30 Маст. фільм «Знахар» [СЦ] (16+).
0.05 Маст. фільм «Вій» [СЦ] (12+).
1.15 «Наша кіно. Гісторыя вялікай любові» (12+).
3.05 Маст. фільм «Сэрца чатырох» [СЦ] (0+).
4.35 Маст. фільм «Любімая дзяўчына» (0+).

РТР—Беларусь

6.00 «Новая раніца».
10.00, 11.30, 17.30, 21.00, 23.00 Беларусь. Навіны.
10.05 Серыял «Сямейны дэтэктыў» (16+).
11.00, 14.00, 17.00, 20.00 Вести.
11.40 «Пра самае галоўнае» (12+).
12.50 «Кропкі над і» (16+).
14.30 Беларусь. Навіны.
14.40 «60 хвілін».
17.40 Серыял «Маскоўская барзая-2» (16+).
18.50 «Прамы эфір» (16+).
21.30, 23.15 Фільм «Суседка» (12+).
23.40 «Гісторыі Вялікай Краіны» (12+).

НТБ—Беларусь

5.55 «Астрапрагноз».
6.00, 7.15, 8.20, 13.25, 16.45, 19.55, 22.35, 23.40 Сёння. Галоўнае.
6.10 «Здорава здаровым быць!» (6+)
6.55 Сфера інтарэсаў.
7.30 Гісторыі выратавання (12+).
8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00 Сёння.
8.35 «НЗ.by».
8.55, 10.35 Серыял «Мядзведжы кут» (0+).
13.30 Надзвычайнае здарэнне.
14.00 Серыял «Гульня» (16+).
16.55 «ДНК» (16+).
18.00 «Чакай мяне» (12+).
20.10, 21.40 Серыял «Ваенная паліцыя» (16+).
21.10 «НЗ.by: час вынікаў».
22.40, 23.55 Серыял «Рэалізацыя» (16+).

8 канал

7.00, 15.50, 19.05, 21.00 «Надвор'е» + «Эрана».
7.05 Мультпарад.
7.30 «Прыколы 13-й школы» (6+).
7.35 Серыял «Хадсан і Рэкс».
8.20 «Вакол свету».
9.10 Драма «Чужое жыццё» (16+).
10.40 Драма «Апошні артыкул» (16+).
12.20 Серыял «Яна напісала забойства» (12+).
13.10 «Любімае кіно».
14.30 «Рэтраспектыва» «Зніклая» (16+).
15.55 Фантастыка «Сакалінае вока».
16.55 Меладрама «Спадчына» (16+).
19.10 Драма «Мэр з Кінгстаўна» (16+).
20.50 «Вечарніца».
21.05 «Урокі Лазуркіна».
21.10 «Камп'ютарныя гульні на экране»
23.25 Трылер «Метро» (16+).
1.35 Трылер «Таксама вядомы» (6+).

Культура

6.30, 7.00, 7.30, 10.00, 12.30, 17.00, 19.30 Навіны культуры.
6.35 «Пешшу...»
7.05 Легенды сусветнага кіно.
7.35, 23.55 Прыступкі цывілізацыі. [СЦ].
8.30 «Жыццё і лёс» [СЦ].
8.45, 15.20 «Прыгоды Электроніка». Маст. фільм.
10.15 «Назіральнік».
11.10, 0.50 XX стагоддзе.
12.45 Навіны. Падрабязна. Кіно.
13.00 Рускі стыль.
13.30, 22.15 «Супрацьстаянне». Маст. фільм [СЦ].
14.35 «Белая студыя».
16.30, 23.25 «Усевалад Шылоўскі. Успамінаючы стары МХАТ...» [СЦ].
17.15, 2.05 П. Чайкоўскі. Сімфонія № 5.
18.00 «Біблейскі сюжэт».
18.30, 21.30 «Забытае рамяство».
18.45 «Клімент Цімірязеў. Неспакойная старасць». Дак. фільм.
19.45 «Галоўная роля».
20.05 «Правілы жыцця».
20.30 «Добрай ночы, малыя!»
20.45 «Абсалютны слых».
21.45 «Рассакрэчаная гісторыя». Дак. серыял.
23.15 Колер часу.

Настальгія

6.00 Маст. фільм «Усё пра Еву» (18+).
8.15, 9.40, 11.30, 15.40, 17.30, 20.45, 21.40, 23.30, 0.55, 3.40, 5.30 Музычная настальгія (12+).
9.00, 15.00, 21.00, 3.00 «Мінулы час» (12+).
10.00, 16.00, 22.00, 4.00 «Народжаныя ў СССР» (12+).
11.00, 17.00, 23.00, 5.00 «Блеф-клуб» (18+).
12.00 «Быў час» (16+).
13.05 Маст. фільм «Амерыканец у Парыжы» (16+).
18.00 «Спяем, сябры!» (12+)
18.55 Маст. фільм «Страх сцэны» (16+).
0.00 Маст. фільм «Гармон» (12+).
1.10 «Ісус Хрыстос — суперзорка». Муз. фільм (16+).

EuroSport 1

4.00 Сёрфінг (6+).
5.00 Скалалажанне (0+).
5.30, 10.15, 11.30, 13.00, 15.00, 17.00, 20.00, 21.00, 2.30 Тэніс (6+).
7.30 Веласпорт. «Джыра д'Італія». Мужчыны (16+).
8.30 Фехтаванне (6+).
9.30 Парусны спорт (6+).
10.00 Кузаўныя аўтагонкі (6+).
20.55, 0.45 Аўтагонкі на выносліваць (6+).
0.50 Тэлечасопіс Discovery Golf (6+).
1.20 One Make Racing (6+).
2.00 Усе віды спорту (6+).

Кінакамедыя

1.20 «Белыя людзі не ўмеюць скакаць» (16+).
3.15 «Касталом» (16+).

4.50 «Залатое дзіця» (16+).
6.20 «Цёрнер і Хуч» (16+).
8.15 «Стэндап пад прыкрыццём» (16+).
10.15 «Красуні» (16+).
12.00 «27 вясельляў» (16+).

14.05 «Вельмі страшнае кіно-3» (16+).
15.30 «Сінъёр Рабінзон» (16+).
17.40 «Ашуканцы» (16+).
19.30 «Каханне злое» (12+).
21.35 «Канваіры» (16+).

23.30 «Джуманджы» (6+).

ТБ3

6.00 Калекцыя «Беларусьфільма» (12+).
9.20 «Старац» (16+).
10.20, 17.45 «Сны» (16+).
11.15 «Перыскоп» (16+).
11.35 «Містычныя гісторыі» (16+).
13.15, 18.45, 2.55 «Сляпая» (16+).
14.40, 20.10, 3.45 «Варажбітка» (16+).
16.05, 21.35 «Анатомія забойства» (16+).
23.15 «Грым» (16+).
0.05 «Дзённік экстрасэнса» (16+).
0.55 «Моцны арэшак-3» (16+).
4.30 «Суд ідзе». Дак. серыял (16+).

ТБ1000

5.30 Лега. Фільм (6+).
7.15 Чаго хочуць жанчыны (16+).
9.35 Правілы здымання: метад Хітча (12+).

11.45 Святоша (6+).
13.45 Жывое (16+).
15.35 Элізіум: рай не на Зямлі (16+).
17.25 Каралеўскі коргі (6+).
19.00 Дарагі Джон (16+).
20.55 Памятай мяне (16+).
22.55 Дывергент (12+).

1.25 Дывергент, глава 2: інсургент (12+).
3.20 Дывергент, глава 3: за сцяной (12+).

ТБ1000 Рускае кіно

5.30 ДынаСіці (6+).
6.20 Пін-код (6+).
7.40 Бода Барода (6+).
8.45 Каляндар ма(й)я (6+).
10.20, 3.00 Вяселле па абмене (16+).
12.00 Стаўка на каханне (12+).
13.35 Каханне без памеру (16+).
15.10 Тэрмінова выйду замуж (16+).
17.05 Самы лепшы дзень (16+).
19.00 Горка! (16+)
20.45 Горка!-2 (16+).
22.30 Шчасця! Здароўя! (16+)
23.55 Сябар на продаж (16+).
1.40 Мужчына з гарантыяй (16+).
4.25 Прыгоды Бураціна (6+).

National Geographic

6.00, 4.40 Навуковыя глупствы (16+).
6.25, 7.10, 22.30 Неверагодны доктар Пол (16+).
7.55, 17.55, 3.50 Інжынерныя ідэі (16+).
8.45, 14.55, 18.50 Сапраўдны суперкар (16+).
9.30, 10.15, 15.40, 19.35, 20.15, 21.00, 21.45, 23.15, 0.00, 1.30, 5.00 Дзікі тунец (16+).
11.00, 11.45, 16.25, 17.10, 20.55, 3.05 Расследаванні авіякатастроф (16+).
12.35 Непакорны востраў (16+).
13.20, 0.45 Ліхтугі за мяжой (16+).
14.10 Аўта-SOS (16+).

ЯСНАе

4.50 Серыял «17 імгненняў вясны» (12+).
6.35 Серыял «Дзяржаўная граніца. «На далёкім паграніччы» (12+).
8.50 «Раніца ЯСНАя».
9.55 Маст. фільм «Стамбульскі транзіт» (16+).
11.20 Серыял «Загадана знішчыць. Аперацыя «Кітайская шкатулка» (12+).
12.55 Серыял «Знішчальнікі. Апошні бой» (12+).
14.40 Серыял «Другія» (12+).
16.15 Маст. фільм «Зоя» (16+).
18.00 Маст. фільм «22 хвіліны» (12+).

19.25 Серыял «Група Зета» (16+).
21.00 Дак. цыкл «Сувязісты».
21.25 Маст. фільм «Без права на выбар» (16+).
23.30 Маст. фільм «Пальма» (6+).
1.20 Дак. фільм «90-я. Камсамольцы» (16+).
2.05 Футбол. Расійская Прэм'ер-Ліга. «Фагел» — «Крылы Саветаў».
3.45 Маст. фільм «Вайна пад дахамі» (12+).

У праграме магчымыя змяненні. Перадрукоўка праграмы забароненая. [СЦ] – фільм транслюецца са скрытымі субцітрамі.

чацвер, 1 чэрвеня ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

Беларусь 1

6.00, 7.20, 8.15 Добрай раніцы, Беларусь!
7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 13.00, 15.00, 17.00, 19.00 Навіны.
7.05, 8.05 Навіны эканомікі.
7.10, 8.10, 18.15, 0.25 Зона Х (16+).
8.50 Выпускныя экзамены па беларускай мове, рускай мове, матэматыцы за перыяд навучання і выхавання на II ступені агульнай сярэдняй адукацыі (з сурдаперакладам).
9.10 «Здорава здаровым быць!» (6+)
9.55, 11.45, 12.15, 13.05 Меладрама «Лепш не бывае» (16+).
10.50, 1.00 «Скажынемаўчы».
15.10, 18.00 Навіны рэгіёна.
15.25, 22.20 Серыял «След» (16+).
17.05 Беларуская часінка.
18.30, 19.20 Меладрама «Вялікія надзеі» (16+).
21.00 Панарама.
21.45 Беларуская супержанчына.
21.55 Адзін дзень (12+).
0.10 Сфера інтарэсаў.
0.45 Дзень спорту.

Беларусь 2

6.00 «Уключайся!» (12+)
10.00, 16.55 Тэлебарометр.
10.05, 18.25 «Сляпая». Дак. драма (16+).
10.35, 18.55 «Знакі лёсу». Дак. драма (16+).
11.05, 17.00 Дэтэктыў «Моцныя арэшкі» (16+).
12.30, 20.45, 21.15 Серыял «Практыка» (12+).
14.20, 19.25 Серыял «ІП Пірагова» (16+).
15.40 Мультсерыял «Прастаквашына» (6+).
15.55 Нічога сабе ньюз (12+).
16.00 «ПІН_КОД» (12+).
21.10 Спартлато 6 з 49, КЕНА.
22.50 «Гастратур» (16+).
23.45 «На тыдзень» (16+).

Беларусь 3

7.00 «Дабраранак».
7.35, 12.30 «Беларуская кухня».
8.05, 13.00, 16.30, 20.30, 0.00 «Навіны культуры».
8.15, 18.40 «Зорге». Маст. фільм (16+) [СЦ].
10.00, 21.05 «Вялікая вайна». Дак. драма (12+).
10.50 «Архітэктура Беларусі» [СЦ].
11.05, 17.10 «Варвара-краса, Доўгая каса». Маст. фільм (6+).
13.10, 21.50 «Бітва за Маскву». Фільм другі (12+) [СЦ].
14.35, 16.40 «Новыя людзі».
15.05 Юбілейны канцэрт шоу-тэатра «Хвілінка».
18.30 «Асобы».
20.40 «Калыханка» (0+).
23.15 «Працоўны фронт». Фільм адзінаццаты.
23.45 «Гісторыя. Факты».

Беларусь 5

7.00 Футбол. Чэмпіянат Іспаніі.
8.55 Футбол. Чэмпіянат Іспаніі. Агляд.
9.50 Слэм-данк.
10.20 Гандбол. Чэмпіянат Беларусі. Мужчыны. «Мяшкоў Брэст» — СКА-Мінск.
11.55 Танцавальны спорт. Чэмпіянат Беларусі.
14.00 Міні-футбол. Чэмпіянат Беларусі.
16.00 Між іншым.
16.20 Хакей. Кубак Будучыні.
18.30 Піт-стоп.
18.50 Міні-футбол. Чэмпіянат Беларусі. У перапынку — «Спорт-цэнтр».
20.50 Фактар сілы.
21.20 Спорт-цэнтр.
21.30 Змешаныя адзінаборствы. UFC.

АНТ

6.00, 7.15, 8.15 «Наша раніца».
7.00, 8.00, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30 Нашы навіны.
7.10, 8.10 «Трывожная кнопка» (16+).
9.10 «Аб'ектыўНа» (16+).
10.10 «Жыць здорава!» (16+)
11.15, 13.15 Фільм «Вярні маё каханне» (16+).
13.45, 23.15 Фільм «Асінае гняздо» (12+).
16.20 «Мужчынскае/Жаночае» (16+).
17.20, 18.20 Інфармацыйны канал (16+).
19.05 Прэм'ера. «Лялькі спадчынніка Тутці» (16+).
20.10 Вячэрнія навіны.
21.15 «Маркаў. Нічога асабістага» (16+).
22.00 «Трэйдар». Фільм (16+).
1.25 Час.

СТБ

6.00, 6.40, 7.45, 8.40 «Раніца СТБ».
6.30, 7.30, 8.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30 Навіны «24 гадзіны».
9.00 Дак. праект. Без падману (16+).
10.40 «Карпаў». Серыял (16+).
11.30 Дак. праект. Знак якасці (16+).
13.15 «Сімвалы Беларусі».
13.55 «Вонкавае назіранне». Серыял (16+).
16.50 «САХР». Серыял (16+).
20.15, 23.05 «СТБ-спорт».
20.20 «Сталічныя падрабязнасці».
20.30 «Міншчына».
20.40 «Беларуская супержанчына».
20.50 «Вышук-3». Серыял (16+).
23.10 Дак. праект. Дзевяностыя (16+).
0.30 «Кіно»: «Дастаць нажы» (16+).

МІР

5.00 Маст. фільм «Брамнік» [СЦ] (0+).
6.15 Мультфільмы (6+).
8.15 Маст. фільм «Як Іванка-дурань за цудам хадзіў» [СЦ] (0+).
10.00, 13.00, 16.00, 18.30, 1.30 Навіны (бягучы радок).
10.10 Маст. фільм «Казка аб страчаным часе» [СЦ] (0+).
11.40 Маст. фільм «Сардэчна запрашаем, або Пабочным уваход забаронены!» [СЦ] (0+)
13.15 «Справы судовыя. Грошы вярніце!» (16+)
14.10, 16.15, 0.30 «Справы судовыя. Бітва за будучыню» (16+).
15.05, 1.00 «Справы судовыя. Новыя гісторыі» (16+).
16.35 «Міравое пагадненне» (16+).
18.50 «Гульня ў кіно» (12+).
22.10 Серыял «Мар'ін гай-2» [СЦ] (12+).
0.05, 1.55 «Наша кіно. Гісторыя вялікай любові» (12+).
1.45 [Не]Фантастыка (12+).
3.25 Тэлесерыял «Школа выжывання ад адзінокай жанчыны з трыма дзецьмі ва ўмовах крызісу» [СЦ] (12+).

РТР—Беларусь

6.00 «Новая раніца».
10.00, 11.30, 14.30, 17.30, 21.00, 23.00 Беларусь. Навіны.
10.05 Серыял «Сямейны дэтэктыў» (16+).
11.00, 14.00, 17.00, 20.00 Вести.
11.40 «Так! Але...»
12.20 «Пра самае галоўнае» (12+).
13.00 «Кропкі над і» (16+).
14.40 «60 хвілін».
17.40 Серыял «Маскоўская барзая-2» (16+).
18.50 «Малахаў» (16+).
21.30, 23.15 Серыял «Паромшчыца. Даліна мары» (12+).
23.40 «Вечар з Уладзімірам Салаўёвым» (12+).

НТБ—Беларусь

5.55 «Астрапрагноз».
6.00, 7.15, 8.20, 13.25, 16.45, 19.55, 22.25, 23.30 Сёння. Галоўнае.
6.10 «Здорава здаровым быць!» (6+)
6.55 Сфера інтарэсаў.
7.30 Гісторыі выратавання (12+).
8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00 Сёння.
8.35, 21.10 «НЗ.by».
8.55, 10.35 Серыял «Мядзведжы кут» (0+).
11.15 Фільм «Можна, я буду звацца цябе мамай?» (16+)
13.30 Надзвычайнае здарэнне.
14.00 Серыял «Гульня» (16+).
16.50 «За граню» (16+).
18.00 «ДНК» (16+).
20.10, 21.30 Серыял «Ваенная паліцыя» (16+).
22.30, 23.45 Серыял «Рэалізацыя» (16+).

8 канал

7.00, 16.35, 18.50, 21.15, 23.05 «Надвор'е» + «Эрана».
7.05 Мультпарад.
7.30 «Прыколы 13-й школы» (6+).
7.35 Серыял «Хадсан і Рэкс».
8.20 «Вакол свету»
9.10 Драма «Чужое жыццё» (16+).
10.45 Драма «Апошні артыкул» (16+).
12.30 Серыял «Яна напісала забойства» (12+).
13.20 «Рэтра ТБ».
14.30 Фантастыка «Багі Егіпта» (16+).
16.40 Фантастыка «Сакалінае вока».
17.25 Меладрама «Спадчына» (16+).
18.55 Драма «Мэр з Кінгстаўна» (16+).
20.50 «Вечарніца».
21.00 «Асалам алейкум, Беларусь!»
21.10 «Урокі Лазуркіна».
21.20 Камедыя «Рыцар дня» (12+).
23.10 Фантастыка «Міратворац».
0.35 Фантастыка «Грань будучыні».
2.30 Камедыя «Каханне і іншы заапарк» (18+).

Культура

6.30, 7.00, 7.30, 10.00, 12.30, 17.00, 19.30 Навіны культуры.
6.35 «Пешшу...»
7.05 Легенды сусветнага кіно.
7.35, 23.55 Прыступкі цывілізацыі [СЦ].
8.30 «Жыццё і лёс» [СЦ].
8.50, 15.20 «Прыгоды Электроніка». Маст. фільм.
10.15 «Назіральнік».
11.15, 0.50 XX стагоддзе.
11.55 «В. Давыдаў і Галіяф». Маст. фільм.

12.45 Навіны. Падрабязна. Тэатр.
13.00 Рускі стыль.
13.30, 22.15 «Супрацьстаянне». Маст. фільм [СЦ].
14.35 «Андрэй Вазнясенскі. Настальгія па цяперашнім». Аўтарскі фільм.
16.30, 23.25 «Усевалад Шылоўскі. Успамінаючы стары МХАТ...» [СЦ]
17.15, 2.05 Уверцюра да оперы «Аберон». Ф. Шуберт.
17.55 Пернікавы домік. «Майстры Расказава» [СЦ].
18.25 «Людзі неба». Дак. фільм. [СЦ].
19.45 «Галоўная роля».
20.05 «Правілы жыцця».
20.30 «Добрай ночы, малыя!»
20.45 «Айбаліт-66». Нармальныя героі заўсёды ідуць у абыход». Дак. фільм.
21.30 «Энігма. Глеб Фільшціскі».
1.25 «Клімент Ціміразеў. Неспакойная старасць». Дак. фільм.
2.45 Колер часу.

Настальгія

6.00 «Быў час» (16+).
7.05 Маст. фільм «Амерыканец у Парыжы» (16+).
9.00, 15.00, 21.00, 3.00 «Мінулы час» (12+).
9.40, 11.30, 14.45, 15.40, 17.30, 18.55, 20.35, 21.40, 23.30, 2.15, 3.40, 5.30 Музычная настальгія (12+).
10.00, 16.00, 22.00, 4.00 «Народжаныя ў СССР» (12+).
11.00, 17.00, 23.00, 5.00 «Блеф-клуб» (16+).
12.00 «Спяем, сябры!» (12+)
12.55 Маст. фільм «Страх сцэны» (16+).
18.00 «Яловая субмарына» (18+).
19.10 Маст. фільм «Ніягара» (16+).
0.00 Маст. фільм «Усё пра Еву» (18+).

EuroSport 1

4.00, 7.30 Скалалажанне. Кубак свету, Сеул. Мужчыны (0+).
5.00 Скалалажанне. Кубак свету, Сеул. Мужчыны і жанчыны (0+).
5.30, 9.30, 10.30, 11.30, 13.00, 15.00, 17.00, 20.00, 21.00, 2.30 Тэніс (6+).
8.30 Усе віды спорту (6+).
8.45 Тэлечасопіс Discovery Golf (6+).
9.15 Кузаўныя аўтагонкі (6+).
20.55, 0.45 Аўтагонкі на выносівасць (6+).
0.50 Скалалажанне. Кубак свету, Солт-Лэйк-Сіці. Мужчыны (0+).
1.30 Сёрфінг (6+).

Кінакамедыя

1.25 «Ну, добры дзень, Аксана Сакалова!» (16+)
3.10 «Дзяўчына з Джэрсі» (16+).
4.55 «Мача і батан» (16+).
6.55 «Мача і батан-2» (16+).
8.50 «Ягуар» (16+).
10.45 «Пяты элемент» (12+).

13.05 «Шэф Адам Джонс» (18+).
15.00 «Каханне злое» (12+).
17.05 «Тэрмінал» (12+).
19.30 «Цыпачка» (16+).
21.20 «Рэальныя кабаны» (12+).

23.15 «Цёрнер і Хуч» (16+).

ТБ3

6.00 Калекцыя «Беларусьфільма» (12+).
8.55 «Старац» (16+).
9.55, 17.45 «Сны» (16+).
10.55 «Паглядзім» (12+).
11.25 «Містычныя гісторыі» (16+).
13.05, 18.45, 2.50 «Сляпая» (16+).
14.35, 20.10, 3.40 «Варажбітка» (16+).
16.05, 21.35 «Анатомія забойства» (16+).
23.15 «Грым» (16+).
0.05 «Дзённік экстрасэнса» (16+).
1.00 «Вады сланам» (16+).
4.30 «Суд ідзе». Дак. серыял (16+).

TV 1000 ТБ1000

5.30 Каралеўскі коргі (6+).
6.50, 0.35 Дарагі Джон (16+).
8.45, 2.20 Памятай мяне (16+).
10.45 Дывергент (12+).
13.10 Дывергент, глава 2: інсургент (12+).
15.10 Дывергент, глава 3: за сцяной (16+).
17.10 Як выйсці замуж за 3 дні (16+).

19.00 Лісты да Джульеты (12+).
20.50 Спяшайся любіць (12+).
22.45 Адзін дзень (16+).
4.05 Смурфікі: закінутая вёска (6+).

ТБ1000 Рускае кіно

5.35 Смяшарыкі (6+).
6.40 Чуч-Мявуч (6+).
8.10 Бода Барода (6+).
9.05 На кручку! (16+)
10.40 Шчасця! Здароўя! (16+)
12.05 Горка! (16+)
13.50 Горка!-2 (16+).
15.35 Нянькі (16+).
17.15 Артэк: вялікае падарожжа (6+).
19.00 Прыватнае піянерскае (6+).
20.50 Прыватнае піянерскае-2 (6+).
22.40 Прыватнае піянерскае-3: прывітанне, дарослае жыццё! (12+)
0.25 Я худзею (16+).
2.05 Нянькі (16+).
3.35 Самы лепшы дзень (16+).
5.20 Фядорына гора (6+).

National Geographic

6.00, 4.45 Навуковыя глупствы (16+).
6.20, 7.05, 22.20 Надзвычайны доктар Пол (16+).
7.45, 17.05 Інжынерныя ідэі (16+).
8.35, 17.50 Сапраўдны суперкар (16+).
9.15, 10.00, 13.30, 14.15, 14.55, 18.35, 5.05 Дзікі тунец (16+).
10.40, 11.25, 15.35, 16.20, 19.15, 20.20, 23.05, 0.25, 2.35, 3.20 Расследаванні авіякатастроф (16+).
12.05, 4.00 Непакорны востраў (16+).
12.50, 1.10 Ліхтугі за мяжой (16+).
21.00, 23.45, 1.55 НЛА: Даследаванне невядомага (16+).
21.40 Злавіць кантрабандыста (16+).

ЯСНАе

5.20 Серыял «Ялта 45» (12+).
7.05 Серыял «Дзяржаўная граніца» (12+).
8.55 «Ясна аб футболе».
9.25 Маст. фільм «Ашалелы аўтобус» (16+).
11.15 Серыял «Смяротная сутычка» (16+).
12.50 Серыял «Знішчальнікі. Апошні бой» (12+).
14.40 Маст. фільм «Прарыў» (16+).
16.05 Серыял «Лёс дыверсанта» (12+).
17.50 Серыял «Аперацыя «Гаргона» (16+).
19.25 Серыял «Група Zeta» (16+).
21.00 «У адкрытым доступе».
21.30 «PROфутбол».
22.00 Маст. фільм «Паляванне на Вервольфа» (12+).
23.55 Маст. фільм «Балада аб бомберы» (16+).
3.00 Маст. фільм «Сыны сыходзяць у бой» (12+).

У праграме магчымыя змяненні. Перадрукоўка праграмы забароненая. [СЦ] – фільм транслюецца са скрытымі субцітрамі.

ХАЦЕЎ ЯК ЛЕПЕЙ, альбо Не будзі ліха, пакуль яно ціха

У першы час пасля вяселля Косця, здавалася, на крылах лётаў, бо, па-першае, кахаў і быў каханы, па-другое, амаль цвяроза бачыў, што Алачка яго і прыгожая, і разумная, і гаспадыня — умелая, акуратная, эканомная... Кожную капейку на ўлік трымае, плануе, што цяпер купіць, што пазней... З любасцю муж глядзеў, як, атрымаўшы яго зарплату (свая зусім невялічкая), Алачка раскладвае ўсе грошы па асобных стосіках, потым кожны з іх змацоўвае сашчэпачкай і пад яе падсоўвае паперку з пameткай, на што можна потым патраціць... Ну ці ж не разумніца?! Ды проста скарб у хаце!

Тая замілаванасць расцягнулася ў мужа на пару-тройку гадоў, пакуль жылі сціпла, пакуль фінансы, хоць зрэдку, ды спявалі ў доме рамансы, пакуль Косця, што называецца, не стаў на ногі, але ж потым...

— Ала, збірайся-прыбірайся! — загадаў неяк жонцы, атрымаўшы добрыя грошы. — Мы з табой ідзём у рэстаран!

— Гэта навошта?! — здзівілася Ала.

— Вячэраць!.. Мы можам сабе дазволіць!

— Што канкрэтна? — строга спытала жонка. — Грошы марнаваць? Пускаць іх на вецер?

— Ну чаму гэта раптам — на вецер? — не здаваўся муж. — Мне павысілі зарплату. Гэта — згадзіся — падзея! Дык чаму б яе не адзначыць?!

— Ну добра, давай, — пайшла на саступкі жонка, згледзеўшы палучку. — Але не ў рэстаране!

— Чаму?

— Таму што дома — разоў у дзесяць танней. А значыць, ты чысціш бульбу і адбіваеш мяса, а я займуся салатамі...

Карацей, вячэра ў іх адбылася, а вось свята — не. Прычым не было яго ні тады, ні значна пазней. Косця — светлая галава! — па-ранейшаму шмат працаваў і прыносіў дамоў неблагія грошы, Алачка яго па-ранейшаму складвала іх у стосікі і найбольшы трымала ў асобнай скарбонцы з пазнакай: «На чорны дзень».

— Ала, можна ж машыну купіць, — прапаноўваў муж.

— І што затым? — пытала яна. — Застацца без капейкі? А дзеці?.. Яны ж хутка падрастуць. Іх вучыць трэба будзе.

— Ну давай тады хоць новую пральную... Старая ўжо «касцямі» грыміць.

— Але ж мые!

Жалезны аргумент!

Косця слухаў іх, злаваў, псіхаваў. Ды што там — шалеў ад сваёй бездапаможнасці, бо зарабляць на нейкі там чорны дзень яму зусім не хацелася!

...Выйсце падказаў выпадак. Неяк, рыхтуючы вячэру, Ала папрасіла яго адкрыць чарговы слоік з «загатоўкай».

Што з ёй пайшло не так? Чаму таматная паста апынулася над сталом на шпалерах, сцяміць ніхто не паспеў.

— Не перажывай, я ўсё пераклею, — гладзячы мокрую сцяну, паабяцаў Косця.

...Новыя шпалеры жонка збіралася купляць на рынку і як мага танней. Муж ёй даводзіў, што скупы два разы траціць і трэба выбіраць якасць.

Ала з боем (і болем!), але ўрэшце згадзілася.

Калі кухонная эпапея скончылася, Косця «выпадкова» пахіснуўся, абапёрся на цешчыну (і яшчэ пасажную!) шафку, у якой жонка трымала посуд. Давялося купіць адно і абнавіць другое.

Затым хітрун пераключыўся на ванную: гантэляй «незнарок» зачапіў умывальнік. Ала, убачыўшы трэшчыну, абазвала мужа вандалам, дзень не размаўляла, але ж потым у ванным пакоі з'явіўся прыгожы «кампакт».

На чарзе была плітка, ад якой «незразумела чаму» сталі адвальвацца кавалачкі.

Факт, што кватэра стала мяняць свой выгляд. Машыну таксама сям'я купіла — новую... «Абнавіць бы яшчэ гардэроб», — думаў Косця.

А тут якраз і нагода: іх запрасілі ў госці, жонка напрасавала сваю адзіную парадную сукенку — разлажыла на канапе. Ён жа, «няўклюдны» муж, праходзячы міма са сваім кубкам кавы, якраз там спатыкнуўся...

— Ну, не бядуй ты па гэтай сукенцы! — прасіў потым жонку, разглядаючы пляму. — Машына ж пад акном, гандлёвы цэнтр працуе...

— Там усё дарагое! — пярэчыла жонка.

Малюнак Анатоля ГАРМАЗЫ.

— Тады што — мы ў госці не ідзём? Ці ты — у халаце?.. Не хочаш? Тады бяры грошы, паехалі!

...На месцы, у тым гандлёвым цэнтры Ала, як ні дзіўна (час яшчэ быў), шмат да чаго прыглядалася, ацэньвала, выбірала і нават прымярала: апроч сукенкі і прыгожых туфель адклала для сябе спадніцу і пару блузак...

— Гэта ўсё? Мы ідзём да касы? — спытаў задаволены муж.

— Пачакай, — спыніла жонка. — Глянь, якое прыгожае норкавае футра вісіць... Можна я памераю?

Косця, ну вядома ж, згадзіўся, але потым, убачыўшы цэннік, тут жа змяніўся з твару. Па ўсім выглядала, што з кавай ён, здаецца, перастараўся.

Алена Несцяронак,
г. Докшыцы.

НЕ ПАТРЭБЕН СЫР, КАЛІ Ў ХАЦЕ МІР

«Ешце сваё!» — правільна людзі кажуць. І я так лічу. Але ж вушы не заткнеш — чую нейчае: «Ах, сушы!», «Ах, ролы ды сыр з цвіллю!» Быццам з'еў іх і ты ўжо — нібыта сучасны, прасунуты, можа, нават далучаны да чагосьці высокага, бо гэта ж модна і дорага, бо гэта — не сваё, не наскае і прытым даступнае: прадаецца не толькі ў сталіцах.

У вёсцы, кажуць, чалавек у краму зайшоў, папытаўся, ці ёсць «Ракфор»? Прадавачка яму: «А што гэта?» — «Ну сыр такі, з цвіллю». — «Не, — жанчына ў адказ, — сыру з ёю — няма, а вось каўбаса, можа, дзе і завалялася? Калі будзеце браць, — пашукаю».

Заўважылі: сыру няма, бо з цвіллю — значыць, сапсаваны. У вёсцы так лічылі, аж пакуль асобныя з нашых мужчын у «дальнабоі» не пайшлі, не сталі па ўсёй Еўропе ездзіць! Адзін — Васечка — аж да Парыжа дапяў! Во ўжо яго Ніначцы шчасце было! Ну як жа: прывязе адтуль касметыкі, прыгожай бялізны, духоў — сяброўкі проста памруць ад зайздрасці!

Карацей, чакала жанчына мужа як ніколі, здаецца. Прычакаўшы, яшчэ ў абдымках спытала, ці прывёз ёй «Чорнай магіі»? — «А як жа, прывёз! — буркнуў стомлены муж. — І не толькі яе! Ты сама там сумкі разбярэш... Я гадзінку пасплю».

І тут жа, бедны, у ложак, бо які там сон у машыне?

Жонка яму падушачку паправіла, спінку абаткнула (усё як ён любіць!), а сама — на кухню і давай калдуны ляпіць, давай булёнчык варыць, бо згаладаўся ж Васечка ў сваёй дарозе, бо сумаваў, нябось, без свежага, без хатняга?!

Да сумак толькі потым чарга дайшла. Адкрыла першую і вочы разбегліся: касметыка, маечкі-кофтачкі, калготы-шпілечкі...

Стала па чарзе прымяраць: у нешта прыбралася, «Чорнай магіяй» надушылася, нафарбавалася. У люстэрка глянула — ну чыстая «мадам» з Парыжа!

А вось другую сумку адкрыла і разгубілася: смурод у хату пайшоў... Быццам мыш недзе здохла?

Паглядзела, перабрала пакункі, — мышкі ў сумцы няма, сыр ёсць, ці нешта падобнае — толькі з цвіллю. Значыць, сапсаваўся... Ну ведама — такая дарога, ды яшчэ і горача там... «Шкода прадукту, — падумала Ніначка, — але ж халера з ім! Свайго сыру купім, а гэты — у смецце ды адразу на вуліцу, каб паху не было... І сумку на плот... Хай паветрае».

Толькі вынесла (уся такая, у «прыкідзе»...) — Вася прачнуўся.

Ніна тут жа ўсё на стол, чарачку наліла і насупраць села — кампліментаў чакаць.

— А сыру французскага чаму не падрэзала? — падцягнуўшы бліжэй талерку з калдунамі, пытаецца муж.

— Дык ён жа не даехаў: сапсаваўся ў дарозе, ад цвілі — аж пасінеў!

— У Францыі такія ядуць, — з веданнем справы адзначыў Вася. — У іх далікатэсам яны лічацца... Я, праўда, не каштаваў, думаў, мо ты зацэніш?

— А я за яго — і вон, — павінілася Ніначка. — Смецця возка забрала.

— Ну і няхай вязе! — усміхнуўся муж. — На стале столькі ўсяго, што і сыр не патрэбны!

Так сказаў Вася. І я так кажу: «Давайце есці сваё!»

С. Вароніна,
Быхаўскі раён.

Рубрыку вядзе Валянціна ДОЎНАР.

АД ЯЕ Ж: нехта дасылае свае гісторыі гады ў рады (то-бок вельмі рэдка), нехта — часцяком, нехта (як надоечы) — упершыню, але ж, на шчасце — з нумарам тэлефона для зваротнай сувязі. Значыць, можна набраць патрэбныя лічбачкі, сказаць чалавеку, што яго, шчыра кажучы, слабаватая гісторыя пагражае заняць ажно цэлую старонку («А я вам столькі і пісаў!» — чуецца ў адказ), што над ёй, той гісторыяй, добра было б яшчэ папрацаваць: істотна скараціць, перакласці з рускай мовы на нашу... («А ў вас што — няма каму гэта зрабіць?» — абураецца аўтар)...

І пры гэтым побач з нумарам тэлефона і без нейкіх там «калі ласка» пазначае: «Ганарар выслаць на адрас...»

Карацей, вясёлыя ў нас чытачы! Каб яшчэ і такія гісторыі...

Пішыце! Конкурс на найлепшую — працягваецца.

Неасабісты суб'ектыў

Урбаністы і рэалісты

Чаму гэтыя два паняцці ў вёсцы трэба сумяшчаць

З рубрыкі «Знарок не прыдумаеш». Калега акурат сёння са смехам расказвала. Едзе яна ў ліфце з дзвюма маладзіцамі. Адна трымае ў руках пакунак, з якога выглядвае расада перцаў. Добрая такая расада, ужо ў пучкі на кветкі пабралася. А другая на поўным сур'ёзе ёй кажа: «Якія ў цябе кветкі прыгожыя! Ужо нават у бутонах. Вось высадзіш на клумбе — праз некалькі дзён харство будзе!» Тая, з перцамі, расказвала калега, вачыма залыпала здзіўлена, не разумеючы, ці троліць яе прыяцелька, ці сур'ёзна гаворыць. Пасля нарэшце асцярожна так адказала: «Гэта перцы...» — «Перцы! Гэта ж трэба!..» — здзіўленне той, што расхвальвала «кветкі», было абсалютна шчырым і непадробным... Пасмяяўшыся, мы з калегай прыйшлі да высновы, што гэту недасведчаную ў парнікова-агародных справах гарадскую даму можна пашкадаваць. Гэта з аднаго боку. А з другога (тут мы дружна ўздыхнулі) — ёй можна пазайздросціць: жывуць жа людзі, якія паняцця не маюць, як выглядае тая расада (а ўжо тым больш — як яна расце і як яе даглядаць). І, трэба думаць, нядрэнна сабе жывуць.

А мінулым летам мы ўсім дарослым натоўпам супакойвалі чатырохгадовую дзяўчынку, якую спасцігла, напэўна, першае ў жыцці расчараванне. Расчараванне было моцнае — да слёз і амаль істэрыкі. Малая ўбачыла сапраўдную... карову. Да гэтага яна бачыла яе толькі на малюнках ды ў мульціках, і ў яе дзіцячым уяўленні рагуля была гэткім хатнім гадаванцам, як коцік або сабачка. Яе гарадская сям'я бывала ўлетку на дачы, але ж там, у садовым таварыстве, толькі коцікі ды сабачкі з гаспадарамі і прыязджаюць. А тут завіталі да прабабулі малой у вёску, а суседка якраз выводзіла на пашу сваю Сліву. Тую Сліву яшчэ трэба бачыць — чырвоная, вялікая, як гара, з белай пысай, закручанымі рагамі — прыгажуня! Але ж малая Сафійка так не думала. «Не хочу такую корову! — раўла яна на ўсю вуліцу. — Она большая и некрасивая!» Пасля, праўда, угаварылі яе даць Сліве хлеба (рагуля надзвычай рахманая і спакойная). Карова асцярожна ўзяла лустачку з маленькай далоні, і ў гэты момант у вачах дзяўчынкі было такое здзіўленае захапленне... як, напэўна, у той жанчынкі ў ліфце, што, пэўна, таксама ўпершыню, убачыла расаду перцаў.

З журналісцкай практыкі выпадак таксама тут дарэчы расказаць. У раённую газету на летнюю практыку прыехала студэнтка-другакурсніца. Яе адправілі пісаць рэпартаж з паспяховай гаспадаркі. У той гаспадарцы гэту «карэспандэнтку» са смехам успамінаюць і сёння, хоць прайшло з яе практыкі гадоў пяць. Спачатку дзяўчына з захопленым крыкам бегала на свінаферме за парасятамі — яна іх ніколі ў жыцці жывымі не бачыла і вельмі хацела злавіць, каб «пажмякаць і пагладзіць». Пасля паехала са старшынёй па палях, і той, дзядзька з гумарам, паказваючы ёй лён, які якраз зацвіў, выдаў: «Гляньце, як хораша красуе пшаніца. Значыць, будзем сёлета з хлебам!» Уявіце твар рэдактара той раёнкі, калі ён пачаў чытаць рэпартаж практыкантки, які пачынаўся прыкладна так: «Блакітнымі хвалямі пераліваецца пшанічнае поле...» Дарэчы, тая практыкантка, кажуць, з журналістыкі пайшла ў ІТ-сектар і робіць там значныя поспехі. Ці даведалася яна ўсё-ткі, чым адрозніваецца лён ад пшаніцы, — гісторыя замоўчвае. Хаця, падазраю, наяўнасць або адсутнасць гэтага ведання ніякім чынам на якасць яе жыцця не ўплывае.

Магчыма, праз пару гадоў яна, зарабіўшы грошы, купіць такі модны сёння домік у вёсцы. І нават калі ўчастак каля доміка будзе зусім невялікі, ёй давядзецца штосьці на ім пасадзіць. Калі не кветкі ці зеляніну, дык хаця б газон. Вось будзе сюрпрыз, калі на ім пачне расці трава, вышэй, чым задумана на газоне! Гэта не гратэскны жарт, я нядаўна сама размаўляла з навaспечанай уласніцай вясковай сядзібы, якая вельмі нават абуралася: «Ты ўяўляеш, аказваецца, гэту траву трэба касіць!..»

МОЖНА, канешне, з гэтых нявыдуманых гісторый па-добраму пасмяяцца, расказаць іх замест анекдота ў якой кампаніі. Але справа ў тым, што падобныя гісторы апошнім часам становяцца не адзінкавымі, як раней, а тыповымі. У нас выраслa ўжо дакладна як мінімум адно пакаленне ўрбаністаў — гараджан, многія з якіх, кажучы вобразна, думаюць, што катлеты растуць у магазіне, малако з'яўляецца з цыстэрны малакавоза, а хлеб пячэцца з манны нябеснай. І падрастае наступнае такое ж пакаленне, у якога няма не тое што вясковых бацькоў або бабуль з дзядамі — нават прабабуль з прадзедамі.

Не скажу, што гэта дрэнна, не скажу, што гэта добра — гэта наша сённяшняя рэальнасць, тут мы паўтараем, лічы, увесь астатні свет, які становіцца ўсё больш урбаністычным. Толькі, як той казаў, гены пальцам не затрэш, а мы на генетычным узроўні... правільна, вясковая нацыя. І дамок у вёсцы — гэта, можна сказаць, становіцца беларускім нацыянальным трэндам. І вось тут урбаністам давядзецца станавіцца рэалістамі. Бо інакш будуць не толькі кур'ёзы, як блакітная пшаніца ці, скажам, пасаджаная ўверх каранямі цыбуля, тут і да бяды недалёка. Успомніце, колькі ўжо было паведамленняў пра не ў час зачынены комін і атручэнне чадам — аж да смяротнага зыходу. Калі даведвацца падрабязнасці — печ амаль ва ўсіх падобных выпадках палілі менавіта гараджане, што прыехалі ў вясковую хату. Я ўжо не кажу пра тое, што карова ці конь можа ўбрыкнуць, курыца дзеўбануць, свіння ўкусіць... тых цікаўных, хто, убачыўшы іх упершыню, захоча іх «пажмякаць і пагладзіць». А яшчэ ёсць столькі траўманебяспечнага гаспадарчага рыштунку, якім можна запрасta пакалечыцца, калі не ўмееш ім карыстацца, а яшчэ і самаўпэўненасць — «а што тут умець!» — распірае...

І тут варта звярнуцца да людзей, якія пра вясковае жыццё маюць хаця б уяўленне. Нам з вамі трэба ўспрыняць як факт, што ёсць тыя, хто пра гэта самае жыццё ўяўленне не мае ад слова «зусім», але вельмі хоча да яго прычыніцца. З іх можна кпіць, за імі можна з цікавасцю назіраць. Але лепш усё ж дапамагчы і падказаць. Карані ж у нас адны, і яны зусім не пад гарадскім асфальтам.

Алена ЛЯЎКОВІЧ.

БЛОНСКИЙ СЕЛЬСКИЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ
Пуховичского района Минской области

проводит открытый аукцион по продаже земельных участков в частную собственность для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома гражданам Республики Беларусь, расположенного в Блонском сельсовете

№ лота	Адрес земельного участка кадастровый номер	Площадь земельного участка, га	Наличие инженерных сетей	Расходы по подготовке документации (рублей)	Начальная цена, рублей	Задаток, рублей
1	д. Заречье, ул. Вишнёвая, уч. 50, кадастровый номер 624480801601000523	0,1519	Сети водоснабжения, электроснабжения, газоснабжения	1999,64 и плюс расходы за размещение объявления	7397,53	739,75
2	д. Заречье, ул. Вишнёвая, уч. 52, кадастровый номер 624480801601000524	0,1519	Сети водоснабжения, электроснабжения, газоснабжения	1818,26 и плюс расходы за размещение объявления	7397,53	739,75

Порядок проведения аукциона оговорен в Положении о его проведении.

